М. В. Альфер   А. П. Сафонава

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА



5

Частка 1

М. В. Альфер   А. П. Сафонава

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Вучэбны дапаможнік для 5 класа
спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання**

У дзвюх частках
Частка 1

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2013

Правообладатель Издательский центр БГУ

УДК 811.161.3(075.3=161.3)-056.264
ББК 74.3
А59

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (кандыдат філалагічных навук дацэнт А. Г. Міхалевіч);
настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Навагрудская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення» А. А. Бахар

**Альфер, М. В.**
А59 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. спец. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / М. В. Альфер, А. П. Сафонава. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2013. — 135 с. : іл.
ISBN 978-985-553-099-3.

Вучэбны дапаможнік для 5-га класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ з беларускай мовай навучання для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні.

**УДК 811.161.3(075.3=161.3)-056.264**
**ББК 74.3+81.2Беи-922**

**ISBN 978-985-553-099-3 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-553-103-7**

© Альфер М. В., Сафонава А. П., 2013
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2013

Правообладатель Издательский центр БГУ

# УМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ

 дамашняе заданне

правіла

 практыкаванні па развіцці звязнага маўлення

? пытанні для самаправеркі

 слоўнік

С. п. самастойная праца

● спрошчанае заданне

● абавязковае заданне

● заданне павышанай складанасці

 давайце пагутарым

Правообладатель Издательский центр БГУ

1

# ПАЎТАРЭННЕ

## 1 ВЕРАСНЯ — ДЗЕНЬ ВЕДАЎ

**1.** Прачытайце ўрывак з верша. Які настрой ён у вас выклікае?

**Звініць званок**

Абрывае восень
За лістком лісток.
Сёння роўна ў восем
Зазвініць званок.
Раніцай у школу
Мы прыйшлі ізноў.
Колькі тут вясёлых
Жартаў і размоў!

*Артур Вольскі*





Правообладатель Издательский центр БГУ

Запішыце першы слупок верша. Колькі тут сказаў? Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

**сёння**

**2.** Прачытайце тэкст.

**Дзень ведаў — свята**

Першага верасня асабліва ўрачыста гучыць школьны званок. Мы пачынаем **вучыцца**. Надышоў новы навучальны год.

Вучэнне — праца. Яна заўсёды радасная. Кожны ўрок прыносіць вучням новае і цікавае. Нездарма першы дзень заняткаў абвешчаны Днём ведаў — святам усёй нашай краіны.

Спішыце. Зрабіце гука-літарны аналіз выдзеленага слова.

Раскажыце, як у вашай школе праходзіць Дзень ведаў.

**3.** Перастаўце літары так, каб атрымалася слова.

ревец, вінуч, окназв, квітек, салк, орук, олакш

Словы запішыце. Вусна складзіце 2—3 сказы з атрыманымі словамі.

## 2

**Успомніце.** Назоўнікі змяняюцца па ліках, родах і склонах. Змяненне назоўнікаў па склонах называецца **скланеннем**.

**1.** Прачытайце тэкст. Вызначце лік, род, склон назоўнікаў.

Стаіць скрозь цішыня. Пахне свежая ралля. Ходзіць восень з голай галавою па ціхіх сцежках. Садзіцца на берагах рэчак. Гладзіць рукою траву. Залоціць вецце бярэзніку. Слухае звон чырвонага асінніку.

Спішыце. Абазначце лік, род і склон назоўнікаў. Колькі склонаў у беларускай мове? Як яны называюцца?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Успомніце.** Для таго каб вызначыць склон назоўніка, трэба знайсці слова, да якога адносіцца назоўнік, і ад яго паставіць пытанне. Па пытанні і прыназоўніку вызначаецца склон.
*Ходзіць дзед з сівою барадою.*
*Ходзіць* (хто?) *дзед.* — Н. с.
*Ходзіць* (з чым?) *з барадою.* — Т. с.

**2.** Змяніце назоўнікі *сяброўка, сябар* па пытаннях.

(Хто?) *сяброўка, сябар.*
Прыйшлі (да каго?) да ..., ... .
Прынеслі (каму?) ..., ... .
Выбралі (каго?) ..., ... .
Чыталі (з кім?) з ..., ... .
Расказвалі (аб кім?) аб ..., ... .

• Запішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў.
• Складзіце і запішыце шэсць сказаў з атрыманымі словазлучэннямі. Абазначце канчаткі і склон назоўнікаў.
• Змяніце па ўзоры словы *настаўніца, настаўнік.*

**3.** Прачытайце сказы. Выпраўце памылкі.

Дзе на ўзмежках верасы, спелыя калышуцца валасы.
Мядзведзь любіць есці лёд. Хлопчык на вуду злавіў парася.

Вусна вызначце склоны назоўнікаў.

**4.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Брат сястру пабачыць рад,
Але строгі ў іх расклад:
Прачынаецца сястра —
Брату спаць ісці пара.



Заліхвацкі вадавоз
Воз вады па небе вёз,
Гэтак грукацеў вядром,
І мы ўсе пазналі … .



Запішыце загадкі разам з адгадкамі. Абазначце склоны назоўнікаў.

## 3

**Успомніце.** Назоўнікі ў адзіночным ліку бываюць першага, другога і трэцяга скланення.

Да **1-га скланення** адносяцца назоўнікі жаночага роду з канчаткамі ***-а (-я)*** у назоўным склоне: *праца, песня*.

Да **2-га скланення** адносяцца назоўнікі мужчынскага роду з нулявым канчаткам і ніякага роду з канчаткамі ***-а, -е, -о, -ё***: *стол□, край□, неба, поле, акно, жыллё*.

Да **3-га скланення** адносяцца назоўнікі жаночага роду з нулявым канчаткам: *ноч□, радасць□, восень□*.

**1.** Прачытайце назоўнікі. Вызначце іх скланенне.

Беларусь, вільгаць, верталёт, восень, вясёлка, дзень, зямля, елка, кропля, крык, лес, лёд, налёт, певень, печ, поле, пралеска, просьба, прыгажосць, радасць, рыбка, сад, святло, сонца, хмара



Правообладатель Издательский центр БГУ

**про́сьба**, **верталёт**

Запішыце словы ў тры слупкі:

1-е скланенне 2-е скланенне 3-е скланенне

**2.** Складзіце сказы. Выберыце словы, якія падыходзяць па сэнсе.

Месяцы восені: (верасень, май, кастрычнік, сакавік, лістапад). У дрэва заўсёды ёсць (лісток, кветка, цень, плод, корань). Пасажырскі транспарт — гэта (камбайн, самазвал, аўтобус, тралейбус, цеплавоз).

Запішыце. Абазначце скланенне выкарыстаных назоўнікаў.

**Успомніце.** Для таго каб вызначыць скланенне назоўніка, трэба:
1) вызначыць род назоўніка;
2) выдзеліць канчатак назоўніка ў назоўным склоне адзіночнага ліку;
3) суаднесці род і канчатак назоўніка з табліцай скланення назоўнікаў і вызначыць скланенне.

Разгледзьце табліцу. Звярніце ўвагу на тое, як змяняюцца канчаткі назоўнікаў.

**1-е скланенне** (ж. р.; ***-а, -я***)

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. с.<br>Р. с.<br>Д. с. | *вад[а], зямл[я]*<br>*вад[ы], зямл[і]*<br>*вадз[е], зямл[і]* | В. с.<br>Т. с.<br>М. с. | *вад[у], зямл[ю]*<br>*вад[ой], зямлё[й]*<br>*у вадз[е], у зямл[і]* |



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2-е скланенне** (м. р.; нулявы канчатак; н. р.; ***-а, -о, -е, -ё***)

| | |
|---|---|
| Н. с. | *лес□, пісьмо, галлё, збожжа, насенне* |
| Р. с. | *лесу, пісьма, галля, збожжа, насення* |
| Д. с. | *лесу, пісьму, галлю, збожжу, насенню* |
| В. с. | *лес□, пісьмо, галлё, збожжа, насенне* |
| Т. с. | *лесам, пісьмом, галлём, збожжам, насеннем* |
| М. с. | *у лесе, у пісьме, у галлі, у збожжы, у насенні* |

**3-е скланенне** (ж. р.; нулявы канчатак)

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. с. | *печ□, восень□* | В. с. | *печ□, восень□* |
| Р. с. | *печы, восені* | Т. с. | *печчу, восенню* |
| Д. с. | *печы, восені* | М. с. | *аб печы, аб восені* |

**3.** Прачытайце тэкст. Вызначце, апавяданне гэта ці апісанне.

Стаялі празрыстай сінявы дні ранняй восені. Неба было чыстае, светлае — хоць нырай ды купайся ў яго бяздонных глыбінях. Плылі ў паветры доўгія і роўныя, як струны, павуцінкі над полем. І сонца залаціла іх. Набліжаўся час школьнай вучобы.

*Паводле Валерыя Кастручына*

Спішыце тэкст. Абазначце скланенне назоўнікаў адзіночнага ліку.

Як вы растлумачыце выраз *і сонца залаціла іх*?

**4.** Падбярыце пары слоў па ўзоры: *работа — праца.*

доктар — ...
мяцеліца — ...
адзенне — ...

лапата — ...
сваволнік — ...
асілак — ...



Правообладатель Издательский центр БГУ

таварыш — ... лес — ...

Словы для даведкі: *завіруха, вопратка, рыдлёўка, гарэза, волат, гай, сябар, урач.*

Запішыце пары слоў. Абазначце іх род і скланенне.

**4**

**1.** Прачытайце словы.

святло, цемра, вучоны, кніга, мудрасць, дабрыня, мова, мара, чалавек, радасць, сяброўства, вёска, газета, сям'я, паветра, казка, вада, вяршыня

- Выпішыце назоўнікі 1-га скланення. Успомніце правіла.
- Выпішыце назоўнікі 1-га скланення. Дапішыце яшчэ пяць назоўнікаў, якія адносяцца да 1-га скланення.
- Складзіце і запішыце чатыры сказы з назоўнікамі 1-га скланення.

**2.** Прачытайце словазлучэнні і складзіце з імі сказы.

шырокая дарог.., з дарог.. з'ехаў, падышоў да рак.., на вяршын.. дуба, над рак.. заззяла, сумаваў па школ..

Сказы запішыце. Абазначце скланенне і выдзеліце канчаткі назоўнікаў.

**3.** Са слоў кожнага радка складзіце сказы. Выдзеленыя словы змяніце, як патрабуе сэнс.

нядаўна, у, бібліятэцы, я, цікавую, **кніга**, узяў

«Святочны карагод», называецца, яна

шмат, у, казак, гэтай, **кніга**, вершаў, і, беларускіх, паэтаў, пісьменнікаў



Правообладатель Издательский центр БГУ

**мова**, любіць, вучыць, **кніга**, нас, родную, сваю

Сказы запішыце. Абазначце скланенне назоўнікаў адзіночнага ліку.

**бібліятэ́ка, пісьме́ннік**

Раскажыце аб тым, якую кнігу вы нядаўна прачыталі.

**4.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.

З захаду падымалася чорная хмара. Набліжалася навальніца. Рвануў вецер. Пачалася сапраўдная бура. Зямля закурылася пылам. Успыхнула маланка. Кусты прыпадалі да самага долу. Лінуў дождж. Вада заліла вуліцы, агароды, канавы. Хата дрыжала пад націскам ветру і, здавалася, перакуліцца.

*Паводле Якуба Коласа*

Спішыце. Падкрэсліце назоўнікі першага скланення. Выдзеліце канчаткі.

---

**5**

**1.** Разгледзьце малюнкі.





Н. с. хто? што?

Гэта дзяўчынка. Гэта кніга.



Правообладатель Издательский центр БГУ

 

В. с. *сустракае* каго? *чытае* што?
Сустракае сяброўку. Чытае кнігу.

Прачытайце сказы і словазлучэнні. Зрабіце вывад.

**Успомніце.** У Н. склоне назоўнікі 1-га скланення маюць канчаткі ***-а (-я)*** і з’яўляюцца дзейнікамі.
У В. склоне назоўнікі 1-га скланення маюць канчаткі ***-у (-ю)*** і з’яўляюцца даданымі членамі сказа. У В. склоне могуць ужывацца прыназоўнікі: ***у, на, па, за, пра, праз, пад***.

**2.** Прачытайце сказы. Абазначце склон выдзеленых назоўнікаў.

1. Раніцай на **траву** выпала **раса**. Узышло **сонца** і сагнала **расу**. 2. **Вучаніца** выразна прачытала **верш**. **Вучаніцу** слухалі ўважліва. 3. Высокая **яліна** расла на ўскрайку вёскі. Пад **яліну** схаваўся вожык. 4. **Бабуля** ведае вельмі многа казак. Мы любім слухаць **бабулю**.

Запішыце сказы па ўзоры: (Хто?) *Вучаніца* [Н. с.] *выразна прачытала* (што?) *верш* [В. с.].



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Змяніце назоўнікі па пытаннях.

| Н. с. хто? што? | В. с. каго? што? |
|---|---|
| зямл□ | зямл□ |
| пчал□ | пчал□ |
| шчак□ | шчак□ |
| настаўніц□ | настаўніц□ |
| сцян□ | сцян□ |
| рук□ | рук□ |
| гадзюк□ | гадзюк□ |

Запішыце па ўзоры:

| | | |
|---|---|---|
| Н. с. | хто? | *гадзюк[а]*, ..., ... |
| | што? | *зямл[я]*, ..., ... |
| В. с. | каго? | *гадзюк[у]*, ..., ... |
| | што? | *зямл[ю]*, ..., ... |

**4.** Прачытайце ўрывак з верша.

Вось табе пад спінку
Мяккую пярынку.
Зверху на пярынку
Чыстую прасцінку.

Вось табе пад вушкі
Белыя падушкі.
Коўдра — пушынка.
Зверху — хусцінка.

*Самуіл Маршак*

Спішыце. Абазначце склон назоўнікаў 1-га скланення адзіночнага ліку.

Ці памятаеце, што было далей у вершы? Раскажыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Разгледзьце малюнкі.





Стаіць (дзе? каля чаго?)
Настаўніца стаіць каля дошк[і].
Прыйшла (да каго?)
Унучка прыйшла да бабул[і].

Прачытайце сказы. Абазначце склон назоўнікаў.

**Успомніце.** Назоўнікі 1-га скланення ў Р. склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі ***-і (-ы)***. Выконваюць ролю даданых членаў сказа. Ужываюцца з прыназоўнікамі ***да, ад, для, без, каля (ля), з, у, акрамя, замест, супраць***.

**2.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце яму загаловак. Які гэта тэкст?

Над нарой ліс.. жыла вавёрк.. . Вавёрк.. скакала з галінк.. на галінк.., насміхалася з ліс.. . Аднойчы раніцай ліс.. лягла каля нар.. і прыкінулася мёртвай. Вавёрк.. зусім блізка прабе-



Правообладатель Издательский центр БГУ

гла каля ліс.. . Ліс.. хутка ўскочыла. Вавёрк.. ледзь не апынулася ў зубах хітрай драпежніц.. .

Запішыце тэкст. Абазначце склон і канчаткі назоўнікаў жаночага роду.

**3.** Прачытайце тэкст.

### Воўк, каза і капуста

Дзядуля задумаўся нездарма: як яму перавезці цераз рэчку ваўка, казу і капусту. Калі ўзяць у човен разам ваўка і казу — воўк казу з’есць. Калі ж узяць казу і капусту — каза капусту з’есць.



Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў 1-га скланення.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце сказы. Пастаўце назоўнікі 1-га скланення ў патрэбным склоне.

У садзе расла яблын.. . Восенню чырванабокія яблыкі ўпрыгожылі яблын.. . Каля яблын.. стаяў поўны кош яблыкаў. На палях наліваецца пшаніц.. . Камбайны хутка пачнуць жаць пшаніц.. . Без пшаніц.. хлеба не будзе.

Спішыце сказы. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў 1-га скланення. У адным сказе (на выбар) абазначце часціны мовы.

## 7

**1.** Разгледзьце малюнкі.





Васіль дорыць кветкі (каму?) **бабулі**. Кветкі стаяць (у чым?) у **вадзе**.

Прачытайце сказы. Абазначце склон выдзеленых назоўнікаў. Назавіце канчаткі. Запішыце.

**лагчы́на, насу́страч**



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Успомніце.** Назоўнікі 1-га скланення ў Д. склоне адзіночнага ліку адказваюць на пытанні: *каму? чаму?* Ужываюцца з прыназоўнікамі ***па, насустрач, услед*** і маюць канчаткі ***-і (-ы), -е (-э)***: *услед* (чаму?) *чарадзе* птушак, *насустрач* (каму?) *мамачцы*.
У М. склоне адзіночнага ліку назоўнікі 1-га скланення адказваюць на пытанні: *аб кім? аб чым?* Ужываюцца з прыназоўнікамі ***пры, аб, на, у, па*** і маюць канчаткі ***-і (-ы), -е (-э)***: (аб чым?) *аб чарадзе птушак,* (пры кім?) *пры мамачцы*.
У сказе назоўнікі Д. і М. склонаў выконваюць ролю даданых членаў.

**2.** Прачытайце словазлучэнні. Абазначце склон назоўнікаў.

гуляць па вуліц.., падарыў сяброўц.., расла пры дароз.., радаваўся сустрэч.., расказаў аб падзе.., прысвяціў матул.., цякла ў лагчын..

• Запішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў.

• Складзіце і запішыце сказы з гэтымі словазлучэннямі. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў 1-га скланення.

• Складзіце словазлучэнні са словамі *рака, кватэра, машына* ў Д. і М. склонах. Запішыце словазлучэнні разам з пытаннямі. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў.

Д. і М. склоны назоўнікаў 1-га скланення адрозніваюцца склонавымі пытаннямі і прыназоўнікамі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Змяніце назоўнікі, як патрабуе сэнс.

купаўся (у чым?) у (рака)
сядзеў (на чым?) на (страха)
расла (пры чым?) пры (дарога)
расказваў (аб кім?) аб (кошка)

Запішыце, выдзеліце канчаткі.

**Успомніце.** Калі аснова назоўнікаў 1-га скланення заканчваецца на зычныя ***г, к, х,*** то ў Д. і М. склонах адзіночнага ліку яны змяняюцца: ***г*** на ***з***, ***к*** на ***ц***, ***х*** на ***с***.
Напрыклад: *нага — назе, рука — руцэ, страха — страсе.*

**4.** Прачытайце назоўнікі. Пастаўце іх у Д. і М. склонах. Выкарыстайце прыназоўнікі.

| Н. с. | Д. с. | М. с. |
|---|---|---|
| краіна | ... | ... |
| паштоўка | ... | ... |
| песня | ... | ... |
| вёска | ... | ... |
| аб’ява | ... | ... |
| дапамога | ... | ... |

• Запішыце словазлучэнні з назоўнікамі ў Д. і М. склонах. Падкрэсліце прыназоўнікі.

• Складзіце тры сказы з гэтымі словазлучэннямі (на выбар). Разбярыце іх па членах сказа.

• Складзіце і запішыце словазлучэнні з назоўнікамі ў Д. і М. склонах са словамі *раніца, навука, матуля*. Запішыце іх. Падкрэсліце прыназоўнікі.


Правообладатель Издательский центр БГУ

8

**1.** Разгледзьце малюнкі.





Мікола капае (чым?) **лапатай.** Юрась размаўляе (з кім?) з **настаўніцай**.

Прачытайце сказы. Абазначце склон і канчаткі выдзеленых назоўнікаў.

**Вучыцеся распазнаваць!**

У Т. склоне адзіночнага ліку назоўнікі 1-га скланення маюць канчаткі ***-ой (-ою), -ай (-аю)***: *сцяной, ракою, дарогай, крыніцаю* або ***-ёй (-ёю), -яй (-яю)***: *зямлёй, песняй*.
У сказе звычайна бываюць даданымі членамі. Ужываюцца з прыназоўнікамі ***з, за, пад, перад, паміж***.

**2.** Прачытайце словазлучэнні. Абазначце склон назоўнікаў.

гуляю з сястрычк.., пішу ручк.., перад дарог.., пілую піл.., расце за вёск.., ляжыць пад бяроз.., цікавай справ.., мама з дачк.., над складанай задачк..

Словазлучэнні запішыце. Вусна складзіце 2—3 сказы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Прачытайце словы.

бабуля, байка, вада, галава, загадка, зямля, калыханка, лічылка, матуля, песня, радня, сям'я, чытанка

• Запішыце назоўнікі ў Т. склоне. Выдзеліце канчаткі.

• Са словамі *байка, радня, сям'я* ў Т. склоне складзіце сказы. Запішыце іх.

• Складзіце і запішыце 4—5 сказаў аб тым, з кім вы праводзіце выхадны дзень. Ужывайце, дзе магчыма, назоўнікі ў Т. склоне. Выразна вымаўляйце іх канчаткі.

**4.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Шануй бацьку з маткаю, другіх не знойдзеш.
За разумнаю галавою і рукам лёгка.
Праўдаю далей дойдзеш.
Адною рукою і вузла не завяжаш.
Дружбу ні каменем цвёрдым, ні сцяною высокаю не мераюць.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў 1-га скланення.

## 9

**1.** Прачытайце тэкст.

### Бярозка

Пасярэдзіне гаю расла тонкая бярозка. Напачатку цяжка жылося маладому дрэўцу. Яго сушыла сонца, гнулі вятры. Кожнае лета бярозка спяшалася як мага больш падрасці, набрацца сілы. А калі прыходзіла восень, лісточкі на ёй жаўцелі. Вецер зрываў іх і разносіў па наваколлі. Зімою бярозцы было яшчэ горш. Завірухі засыпалі яе снегам, маразы кусалі яе галінкі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Вясною нехта абламаў галінкі бярозкі, на кары нарабіў насечак. З іх сачыліся буйныя кроплі-слёзы. Так абышліся з бярозкай людзі. І ўсё ж бярозка вырасла. Стройнае беластволае дрэўца ўпрыгожыла бярозавы гай. *Паводле Алены Раманенка*

Перакажыце тэкст па плане.

1. Тонкая бярозка.
2. Што рабіла бярозка летам?
3. Як жыла бярозка восенню?
4. Жыццё бярозкі зімой.
5. Што зрабілі людзі?
6. Бярозка вырасла.

Пераказ запішыце.

**2.** Падбярыце пары слоў па ўзоры.

*бяроза — лес*
*дрэва — мэбля*
*машына — кола*
*сабака — будка*
*карова — малако*

яблыня — ...
тканіна — ...
птушка — ...
вавёрка — ...
пчала — ...

Запішыце пары слоў. Абазначце скланенні назоўнікаў.

**10**

**1.** Разгледзьце малюнкі.



хто?
Гэта мядзведзь.



што?
Гэта бярлог.



Правообладатель Издательский центр БГУ



што?
Дом стаіць у садзе.



хто?
Хлопчык слухае салаўя.

Прачытайце сказы. Абазначце склон назоўнікаў 2-га скланення.

**апеты́т, сталява́р**

**2.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце назоўнікі ў В. склоне.

малады лес, шырокае поле, беларускі край, школьны стол, родны брат, шэры верабей, знатны сталявар, цікавае здарэнне, добры апетыт

- Запішыце словазлучэнні з назоўнікамі ў В. склоне. Выдзеліце канчаткі.
- Складзіце з гэтымі словазлучэннямі чатыры сказы. Абазначце склон назоўнікаў 2-га скланення.
- Складзіце сказы з назоўнікамі *вецер, жыццё, зубр, камар* у Н. склоне і ў В. склоне. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў 2-га скланення.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Які дуб, такі клін, які бацька — такі сын.
Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей.
Чужое дабро вылазіць праз рабро.
За багацце розуму не купіш.

Спішыце. Абазначце склон назоўнікаў 2-га скланення.

> **Успомніце.** Канчаткі назоўнікаў 2-га скланення, якія адказваюць на пытанне *што?*, у Н. і В. склонах супадаюць:
> (што?) *сонц*[*а*] (Н. с.) — *бачу* (што?) *сонц*[*а*] (В. с.)
> (што?) *лес*□ (Н. с.) — *бачу* (што?) *лес*□ (В. с.)
> Канчаткі назоўнікаў 2-га скланення, якія адказваюць на пытанне *хто?*, у Н. і В. склонах не супадаюць:
> (хто?) *сябар*□ (Н. с.) — *бачу* (каго?) *сябр*[*а*] (В. с.)
> (хто?) *вучань*□ (Н. с.) — *бачу* (каго?) *вучн*[*я*] (В. с.)

> **Успомніце.** Адрозніць В. склон назоўнікаў 2-га скланення, якія адказваюць на пытанне *што?*, ад Н. склона дапамагаюць назоўнікі 1-га скланення. У В. склоне яны маюць канчаткі ***-у (-ю)***:
> *пад'ехаў аўтамабіль (пад'ехала машын*[*а*] *)* — Н. с.
> *вадзіць аўтамабіль (вадзіць машын*[*у*] *)* — В. с.
> *слухаць канцэрт (слухаць песн*[*ю*] *)* — В. с.

**4.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.

Выйшла бабуля ў сад, села на ўслончык і пачала вязаць. Дзень быў цёплы, ласкавы. Ля бабуліных ног бегаў коцік. Вязала бабуля, вязала, ды седзячы і заснула. Коцік убачыў клубок, скокнуў да яго і торкнуў лапкай. *Паводле Васіля Хомчанкі*

Спішыце. Абазначце склон назоўнікаў 2-га скланення.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## 11

**1.** Разгледзьце малюнкі.





Кот злез (з чаго?) з дрэва.
(У каго?) у дзятла моцная дзюба.

Прачытайце сказы. Выдзеліце канчаткі і склон назоўнікаў 2-га скланення.

Назоўнікі 2-га скланення ў Р. склоне маюць канчаткі ***-а (-я)*** або ***-у (-ю)***. Ужываюцца з прыназоўнікамі ***з, у, ад, да, для, без, каля, акрамя, з-за***.

**2.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце іх у Р. склоне. Ужывайце прыназоўнікі.

беларускі народ, вялікі горад, жытнёвы хлеб, лепшы сябар, льняное поле, моцны вецер, старэйшы брат, цікавы дыспут

• Запішыце словазлучэнні з назоўнікамі ў Р. склоне. Выдзеліце канчаткі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Складзіце і запішыце чатыры сказы з гэтымі словазлучэннямі. Разбярыце іх па членах сказа.

• Складзіце і запішыце словазлучэнні з назоўнікамі *вырай, здароўе, агонь, вучань* у Р. склоне.

**ды́спут**

Наступныя назоўнікі мужчынскага роду ў Р. склоне маюць канчаткі ***-у (-ю)***:

1. Назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці, уласцівасці, стан чалавека: *гонар — гонару, розум — розуму, гераізм — гераізму, шум — шуму, спакой — спакою, колер — колеру, гнеў — гневу, сорам — сораму*.

2. Назоўнікі, якія абазначаюць з’явы прыроды: *вецер — ветру, гром — грому, мароз — марозу, агонь — агню, дождж — дажджу*.

3. Назоўнікі, якія абазначаюць:

— матэрыялы і рэчывы: *алюмінію, воску, чыгуну, клею*;

— зборныя прадметы: *лесу, гаю, грузу, саду*.

Назоўнікі, якія абазначаюць канкрэтныя прадметы ці асоб, у Р. склоне маюць канчаткі ***-а (-я)***: *стала, сябра, лася*.

Назоўнікі ніякага роду маюць канчаткі ***-а (-я)***: *возера, сяла, калосся, поля*.

**3.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Як будзем касіць, даждж(а, у) не будзем прасіць.
Многа снег(а, у) — многа хлеба.
Агн(я, ю) ў шапцы не носяць.
Кармі (конь) не пугай, а сенам з луг(а, у).
Колькі розум(а, у), столькі і работы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Спішыце. Выберыце патрэбныя канчаткі назоўнікаў.

**4.** Складзіце сказы (вусна) з назоўнікамі *стол, сорам, агонь, пясок, вінаград* у Р. склоне.

Карыстайцеся правілам. Якое з гэтых слоў «лішняе» адносна канчаткаў назоўнікаў у Р. склоне? Чаму?

**5.** Прачытайце ўрывак з верша.

Колькі шуму, колькі смеху:
Лепім дзеда мы са снегу!
Задала зіма работы:
Па двары кацілі ўтрох —
І паставілі ля плота.
Дзед стаіць, хоць і без ног.

*Ніл Гілевіч*

Спішыце. У назоўніках 2-га скланення выдзеліце канчаткі і абазначце склон.

**12**

**1.** Разгледзьце малюнкі.





Кот сядзіць (каля чаго?) каля стала.
Кот залез (пад што?) пад ложак.

Прачытайце сказы. Выдзеліце канчаткі і склон назоўнікаў 2-га скланення.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Успомніце.** Канчаткі назоўніка, якія адказваюць на пытанне *каго?*, у Р. і В. склонах супадаюць: *спытаў* (у каго?) *у брата*, *сумна* (без каго?) *без сябра* (Р. с.) — *любіў* (каго?) *брата*, *падтрымаў* (каго?) *сябра* (В. с.).

**2.** Прачытайце. Дапішыце канчаткі назоўнікаў. Растлумачце іх правапіс.

Турысты прайшлі каля лес.., горад.. .
Падрыхтаваліся да ўрок.., ранішнік.. .
Не ведалі страх.., бол.. .
Поспехі брат.., студэнт.. .
Многа шум.., смех.. .
Пайшлі на пол.., у лес.. .

Спішыце. Абазначце склон назоўнікаў 2-га скланення.

Адрозніць Р. склон назоўнікаў 2-га скланення, якія адказваюць на пытанне *каго?*, ад В. склону дапамагаюць назоўнікі 1-га скланення. Назоўнікі 1-га скланення ў Р. склоне маюць канчаткі ***-ы (-і)***, у В. ***-у (-ю)***:
*учынак юнака (учынак дзяўчынкі )* — Р. с.
*спытаць студэнта (спытаць дачку )* — В. с.
*сумка хлопчыка (сумка дзяўчынкі )* — Р. с.
*успамінаць сябра (успамінаць сяброўку )* — В. с.

**3.** Прачытайце сказы. Абазначце склон выдзеленых назоўнікаў.

Нельга кідаць **сябра** ў бядзе. Пісьмо **сябра** мяне вельмі ўзрадавала. Настаўнік выклікаў **вучня** да дошкі. Адказ **вучня** быў


Правообладатель Издательский центр БГУ

правільным. Дзеці знайшлі ў садзе **вожыка**. Іголкі **вожыка** небяспечныя для ворага.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон выдзеленых назоўнікаў.

**4.** Падбярыце пары слоў па ўзоры.

| | |
|---|---|
| *ландыш — вясна* | яблык — ... |
| *дуб — ліст* | сасна — ... |
| *сонца — дзень* | месяц — ... |
| *футбол — мяч* | хакей — ... |

• Запішыце пары слоў па ўзоры. Абазначце іх скланенне.

• Выберыце назоўнікі 2-га скланення. Пастаўце іх у Р. і В. склонах.

• З назоўнікамі 2-га скланення ў Р. і В. склонах складзіце сказы. Запішыце іх.

## 13

**1.** Разгледзьце малюнкі.







Правообладатель Издательский центр БГУ

Касір дае (каму?) **пакупніку** рэшту.

Хлопчык бяжыць насустрач (чаму?) **цягніку**.

Прачытайце сказы. Вызначце склон назоўнікаў 2-га скланення.

> Назоўнікі 2-га скланення ў Д. склоне маюць канчаткі ***-у (-ю)***. Ужываюцца з прыназоўнікамі ***па, насустрач*** і без прыназоўнікаў.

**2.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце іх у Д. склоне. Выкарыстайце прыназоўнікі.

герой вайны, летні вечар, свежы вецер, свежы хлеб, старанны вучань, яснае сонейка

- Запішыце словазлучэнні. Пастаўце іх у Д. склоне. Выдзеліце канчаткі.
- Складзіце і запішыце сказы з гэтымі словазлучэннямі ў Д. склоне.
- Дапішыце назоўнікі 2-га скланення ў Д. склоне да дзеясловаў *падарыў, дапамог*. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў.

С. п. **3.** Прачытайце тэкст.

Зайцу можа пазайздросціць любы звер. Яго імя ўвекавечана ў казках, прымаўках і прыказках. Заяц у іх самы дужы, самы спрытны і самы храбры. Асабліва ўдаецца зайцу ашукваць шэрага ваўка. Успомніце мультфільм «Ну, пачакай!». Гэтаму мультфільму радуюцца ўсе дзеці.



Правообладатель Издательский центр БГУ

А вы любіце гэты мультфільм? Падзяліцеся думкамі.

Знайдзіце ў тэксце назоўнікі 2-га скланення. Вызначце іх склон.

**4.** Да дзеясловаў дапішыце назоўнікі 2-га скланення ў Д. склоне. Выкарыстайце прыназоўнікі.

уручаць (каму?) ..., плыць насустрач (чаму?) ..., даць (каму?) ..., радавацца (чаму?) ..., спяшаецца насустрач (каму?) ...

Запішыце атрыманыя словазлучэнні.

## 14

**1.** Разгледзьце малюнкі.





Самалёт ляціць (над чым?) над горадам.
Зімой дрэвы пакрываюцца (чым?) інеем.

Прачытайце сказы. Абазначце склон назоўнікаў 2-га скланення.

> Назоўнікі 2-га скланення ў Т. склоне маюць канчаткі ***-ам (-ем), -ом (-ём)***. Ужываюцца з прыназоўнікамі ***з, за, над, пад, перад, паміж***.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Пастаўце назоўнікі 2-га скланення ў Т. склоне.

| | | |
|---|---|---|
| стол — над … | гаспадар — … | сын — з … |
| калектыў — з … | снег — са … | сэрца — з … |
| дрэва — пад … | полымя — з … | |

• Запішыце пары слоў па ўзоры: *стол — над сталом*.

• Складзіце і запішыце словазлучэнні па ўзоры: *стол — над вучнёўскім сталом*.

• Складзіце і запішыце чатыры сказы з назоўнікамі 2-га скланення ў Т. склоне. Разбярыце іх па членах сказа.

**3.** Прачытайце спачатку назоўнікі — назвы прафесій, а потым назоўнікі — назвы прадметаў. Пастаўце іх у Т. склоне.

агонь, бабёр, доктар, дуб, камбайнер, ландыш, машыніст, повар, сонца, трактарыст, шафёр

Запішыце па ўзоры: *машыніст — машыністам*.

Складзіце (вусна) некалькі сказаў з гэтымі назоўнікамі ў Т. склоне.

**4.** Дапішыце сказы, ставячы прапушчаныя назоўнікі ў Т. склоне.

1. Памяшканне для аўтамабіляў называюць … . 2. Пясчаны бераг каля ракі называецца … . 3. Ігра аркестра кіруецца … . 4. Зімой дрэвы часта пакрываюцца іскрыстым … . 5. Смачна пахне свежым … .

Словы для даведкі: *хлеб, дырыжор, іней, гараж, пляж.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**15**

**1.** Разгледзьце малюнкі.






Паштальён едзе (на чым?) **на веласіпедзе**.

Экскурсавод расказваў (аб кім?) **аб герою**.

Прачытайце сказы. Абазначце склон выдзеленых назоўнікаў 2-га скланення.

> Назоўнікі, аснова якіх заканчваецца на цвёрды зычны, у М. склоне маюць канчатак ***-е***: *на стале, па страсе*.
>
> Назоўнікі з асновай на ***г***, ***к***, ***х*** могуць мець і канчатак ***-у***: *на даху, па кавалку*.
>
> Канчатак ***-ы*** ўжываецца ў назоўніках пасля зацвярдзелых зычных: *аб сонцы, у моры, на дожджы*.
>
> Назоўнікі з мяккай асновай маюць канчатак ***-і***: *на кані, у выраі*.
>
> Назоўнікі, якія называюць асоб, маюць канчаткі ***-у (-ю)***, ***-е***: *па тату, аб кавалю, аб сыне, аб юнаку*.
>
> Назоўнік *малако* мае канчатак ***-э***: *у малацэ*.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце словы.

бераг, веласіпед, вецер, возера, гай, дождж, дупло, дырэктар, лес, паветра, пясок, тэлеграф, тэлефон, час, шалаш

**веласіпе́д, дырэ́ктар, тэлегра́ф**

• Пастаўце назоўнікі ў М. склоне. Выкарыстайце прыназоўнікі. Запішыце па ўзоры: *неба — на небе*. Пастаўце націск.

• Пастаўце назоўнікі ў М. склоне. Складзіце тры словазлучэнні. Выкарыстайце прыназоўнікі. Запішыце словазлучэнні па ўзоры: *лес — ішоў* (па чым?) *па лесе*.

• Пастаўце назоўнікі ў М. склоне. Складзіце з імі чатыры сказы і запішыце іх.

**3.** Прачытайце пары слоў. Запомніце іх напісанне.

| | |
|---|---|
| паро**г** — на паро**з**е | гаро**х** — у гаро**с**е |
| парахо**д** — на парахо**дз**е | пло**т** — на пло**ц**е |
| сто**г** — у сто**з**е | са**д** — у са**дз**е |

Вусна складзіце з гэтымі назоўнікамі сказы.

**4.** Прачытайце сказы. Назоўнікі, што ў дужках, пастаўце ў М. склоне.

Залатая восень прыгожая і ў (*поле*), і ў (*горад*). Мой брат працуе на (*завод*), а сястра вучыцца ва (*універсітэт*). Па блакітным (*неба*) павольна плывуць воблачкі. Круглы год на (*стадыён*) чуваць звонкія галасы аматараў спорту. Весела кружацца ў (*танец*) дзеці.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## 16

**1.** Прачытайце апавяданне дзяўчынкі на тэму «Як я ем».

За сталом я сяджу заўсёды правільна. Сачу за тым, каб спіна была прамая, а ногі роўна стаялі на падлозе. Ніколі не абапіраюся локцямі аб стол. Я ўмею карыстацца нажом і відэльцам. Відэлец заўсёды трымаю ў левай руцэ, а нож — у правай. Хлеб бяру маленькімі кавалачкамі. Ніколі не набіраю поўны рот ежы. Рукі заўсёды выціраю сурвэткай. Пасля таго як пад'ем, дзякую таму, хто мяне накарміў. *З кнігі «Урокі ветлівасці»*

Раскажыце, як трэба паводзіць сябе за сталом.

А як гэта робіце вы? Свой расказ запішыце.

**2.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце да яго загаловак.

Хораша летам на лузе. Сухое паветра моцна настоена на тонкім водары смолкі, на мядовым паху чырвонай канюшыны. Усё жывое на лузе вабіць гэтая прыгажосць.

Добра такой парой паляжаць у цяньку дрэў, асвяжыцца ў возеры. Прыемна прабрацца на світанні да азярца, закінуць вуду, моўчкі сачыць за паплаўком. *Паводле Рыгора Ігнаценкі*

Спішыце. Абазначце склон назоўнікаў 2-га скланення.

Раскажыце, як вы любіце праводзіць летні адпачынак.

## 17

**1.** Прачытайце словы.

алея, аповесць, Беларусь, восень, жарт, карабель, крэпасць, любоў, медаль, медзь, моладзь, надвор'е, памяць, пля-



Правообладатель Издательский центр БГУ

цоўка, радасць, рысь, рунь, сініца, свежасць, смеласць, сувязь, схільнасць, тыдзень, цікавасць, электрычнасць, электрастанцыя

Выпішыце назоўнікі жаночага роду з нулявым канчаткам.

**схі́льнасць, электры́чнасць, су́вязь**

Назоўнікі жаночага роду з нулявым канчаткам адносяцца да 3-га скланення: *моладзь□, крэпасць□, Беларусь□*.

С. п. **2.** Прачытайце верш. Назавіце назоўнікі 3-га скланення.

О Беларусь,
мая калыска,
Жыццё маё,
прытулак мой!
З гарачаю любоўю
нізка
Схіляюся
перад табой.

*Пятро Глебка*

Вывучыце верш на памяць. Запішыце па памяці.

**3.** Прачытайце тэкст.

**Крэпасць-герой**

Брэсцкая крэпасць прыняла на сябе моцны ўдар ворагаў.

У крэпасці нашы салдаты і афіцэры стаялі насмерць. Ад крэпасці засталіся руіны. Многія яе абаронцы загінулі.

У крэпасць часта прыходзяць людзі. Яны ўшаноўваюць памяць загінуўшых.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Выпішыце назоўнікі 3-га скланення па ўзоры: (што?) *крэпасць*. Выдзеліце канчаткі.

Знайдзіце тэксты пра Брэсцкую крэпасць у бібліятэцы. Прачытайце іх. Раскажыце сябрам.

**4.** Са слоў кожнага радка складзіце сказы. Выдзеленыя назоўнікі стаўце ў патрэбным склоне.

возерам, **ноч**, над, хмары, чорныя, павіслі
дажджу, пасля, паветра, напоўнілася, **вільгаць**
небасхіл, першыя, афарбавалі, промні, **чырвань**, сонечныя
качак, возерам, пранеслася, над, **гладзь**, чарада

Сказы запішыце. Выдзеліце канчаткі выдзеленых слоў.

**педáль**

**18**

**1.** Прачытайце словы.

гусь, даль, восень, радасць, педаль

- Запішыце гэтыя назоўнікі ў В. склоне.
- Складзіце словазлучэнні з гэтымі назоўнікамі ў В. склоне. Запішыце іх.
- Складзіце сказы з гэтымі назоўнікамі ў Н. і В. склонах. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў.

**Успомніце.** Назоўнікі 3-га скланення ў Н. і В. склонах маюць нулявы канчатак.
Назоўнікі ў В. склоне ўжываюцца з прыназоўнікамі: ***з, у, на, па, за, пад, пра, праз***.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце сказы.

1. Краю роднаму прыносім шчырую любоў. 2. Беларусь ганарыцца сваімі сынамі і дочкамі. 3. Пра Беларусь складзена многа вершаў і песень. 4. Шырокая плынь ракі дыхала свежасцю. 5. У акно пазірае белая месячная ноч. 6. Усю ноч не сціхаў моцны дождж.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў 3-га скланення.

**3.** Замяніце словазлучэнні адным назоўнікам 3-га скланення. Выкарыстайце словы *моладзь, поўнач, глуш, старасць*.

глухое месца — ...
дванаццаць гадзін ночы — ...
маладое пакаленне — ...
стары ўзрост — ...

• Запішыце па ўзоры: *глухое месца — глуш*.

• Запішыце назоўнікі 3-га скланення. Пастаўце іх у В. склоне. Выкарыстайце прыназоўнікі.

• Складзіце сказы з назоўнікамі *восень, даль*, ужываючы іх у Н. і В. склонах.

**4.** Прачытайце сказы.

1. Цёмная ноч густа завалакла чарнатою даль. 2. Даль палёў серабрылася пад халодным месячным святлом. 3. Праца на карысць людзям прыносіць радасць. 4. Лёгкі вецер калыша марскую гладзь.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склоны назоўнікаў 3-га скланення.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**19**

**1.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце назоўнікі 3-га скланення ў патрэбным склоне.

у пачатку (*восень*), жыць у (*глуш*), дажыць да (*старасць*), вырабляць з (*медзь*), гараць у (*печ*), жыве ў (*Беларусь*), ускочыў ад (*радасць*), вучыць (*ветлівасць*), расказаў аб (*смеласць*) і (*мужнасць*)

Словазлучэнні запішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў 3-га скланення.

**Успомніце.** У Р., Д. і М. склонах назоўнікі 3-га скланення маюць аднолькавыя канчаткі ***-ы (-і)***: *радасц[і], ветлівасц[і], поўнач[ы]*.
У Р. склоне назоўнікі 3-га скланення могуць ужывацца з прыназоўнікамі ***з, у, ад, да, для, без, каля***.
У Д. склоне — з прыназоўнікамі ***па, насустрач***.
У М. склоне — з прыназоўнікамі ***у, аб, на, па, пры***.

**2.** Прачытайце сказы. Назоўнікі, што ў дужках, пастаўце ў патрэбным склоне.

Сярод (*ноч*) у акно зазірнуў месячык. У пачатку (*восень*) птушкі збіраюцца ў далёкую дарогу. Цяжка плысці супраць (*плынь*) ракі. Пасля дажджу пахне (*вільгаць*). Такой (*прыгажосць*) не сустрэнеш больш нідзе. З самага дзяцінства трэба вучыцца (*працавітасць, стараннасць*).

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў 3-га скланення.



Правообладатель Издательский центр БГУ

С. п. **3.** Прачытайце тэкст. Пастаўце назоўнікі 3-га скланення ў патрэбным склоне.

Геолагі выявілі ў Беларусі велізарныя залежы калійнай сол.. . Калійнай сол.. надаюць вялікае значэнне працаўнікі сельскай гаспадаркі. У беларускай калійнай сол.. ёсць такая жыватворная сіла, якая неабходна раслінам. Першы горад шахцёраў на Беларус.. назвалі Салігорскам.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў 3-га скланення.

**4.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

Чалавек без сябра, што ежа без солі.
Каб пазнаць чалавека, трэба з ім пуд солі з'есці.
Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве — і ў полі не гаснуць.
Хто з маладосці працуе, той на старасці не шкадуе.

Спішыце. Абазначце склон і выдзеліце канчаткі назоўнікаў 3-га скланення.

---

**20**

**1.** Складзіце словазлучэнні з назоўнікамі 3-га скланення ў Т. склоне.

парк (над чым?) над Свіслач.., сустрэць (як?) з радасц.., дакрануцца (чым?) далон.., вабіць (чым?) прыгажосц.., знаходзіцца (дзе?) на сенажац.., пасыпаць (чым?) сол.., гнаўся (за кім?) за мыш..

• Запішыце. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў 3-га скланення.



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Складзіце чатыры сказы са словазлучэннямі (на выбар). Выдзеліце канчаткі назоўнікаў 3-га скланення.

• Складзіце і запішыце сказы з назоўнікамі *ціш, глуш, ноч* у Т. склоне.

**Успомніце.** У Т. склоне назоўнікі 3-га скланення маюць канчаткі ***-у (-ю)***. Ужываюцца з прыназоўнікамі ***з, за, над, пад, перад***.
У Т. склоне можа быць падаўжэнне апошняга зычнага асновы паміж галоснымі: *ноччу, рунню, ціішу*.
Зычныя ***ф, б, п, м, р, ў*** не падаўжаюцца.

**2.** Прачытайце тэкст.

Цёмная ноч густа ахутала наваколле. Пахучай свежасц.. веялі лугавыя травы. Над рачной гладдз.. падымаўся густы туман. Небасхіл пакрыўся чырван.. .

Спішыце. Пастаўце назоўнікі 3-га скланення ў Т. склоне. Прыдумайце загаловак. Які гэта тэкст?

**3.** Са слоў пабудуйце сказы, ужываючы назоўнікі 3-га скланення ў Т. склоне.

балота, ад, цягнуць, вільгаць
чайкі, над, насіцца, гладзь, вада, люстраная
поезд, на, ноч, станцыя, прыбыць
у, птушкі, вырай, збіраюцца, восень
лес, твар, у, свежасць, дыхнуць, спакой, і, з

Сказы запішыце. Падкрэсліце ў назоўніках Т. склону падоўжаныя зычныя. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў 3-га скланення.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.

Ішлі дзяўчынкі раніцай у школу. Сонца толькі што ўзышло. Над Свіслаччу рассеяўся туман. Дзяўчынкі спыніліся каля вады. У яе люстраной гладзі быў бачны край неба з белымі воблачкамі, прыбярэжныя кусты і хаты. Дзяўчынкі залюбаваліся прыгажосцю наваколля. Сэрцы напоўніліся радасцю.

Дзеці, вучыцеся заўважаць хараство ў прыродзе!

Спішыце. Знайдзіце назоўнікі 3-га скланення. Абазначце іх склон.

---

**21**

**1.** Прачытайце тэкст.

### Мая раніца

Чаму я ні разу не спазніўся ў школу? Таму што ў мяне ёсць надзейны сябар, які будзіць мяне. Гэта будзільнік. Я сам яго заводжу і стаўлю стрэлку званка на час, які мне патрэбны.

Адзенне, абутак, партфель з падручнікамі і сшыткамі я падрыхтаваў яшчэ звечара.

Устаю, праветрываю пакой, прыбіраю пасцель. Потым мыюся і снедаю. Паспяваю яшчэ прыбраць са стала.

У школу прыходжу заўсёды за пятнаццаць хвілін да пачатку ўрокаў.

Я ўжо так прывык да свайго раскладу, што цяпер прачынаюся нават і без будзільніка. Прывычка — добрая справа.

*Паводле Васіля Віткі*

Які гэта тэкст: дыялог ці маналог?

Складзіце план тэксту. Перакажыце яго ад свайго імя. Пераказ запішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Складзіце некалькі сказаў на тэму «У паходзе».

Выкарыстайце словы *даль, радасць, вільгаць, плынь, сенажаць.*

Запішыце.

## 22

**1.** Пастаўце наступныя назоўнікі ў Н. склоне множнага ліку.

воблака, вуліца, вучань, дарога, жыхар, зорка, народ, ноч, пасажыр, поле, сасна

Запішыце па ўзоры: *вучань — вучні*.

Выдзеліце канчаткі назоўнікаў множнага ліку.

Як адрозніць назоўнік у множным ліку ад назоўніка ў адзіночным ліку?

**2.** Прачытайце верш.

### Увосень

Спрытна шышкі лушчылі
шустрыя вавёркі,
вожыкі калючыя
ўцяплялі норкі.

Вербы задуменныя
плакалі без сілы,
пятакамі меднымі
сыпалі асіны.

Чырванелі гронкамі
каля хат рабіны,
дзесь у трубы громкія
ўсе ласі трубілі.

*Ніл Гілевіч*

- Выпішыце назоўнікі множнага ліку. Выдзеліце канчаткі.
- Аб'яднайце назоўнікі множнага ліку ў групы з абагульняльнымі словамі *дрэвы, звяры*. Запішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Складзіце і запішыце два сказы з назоўнікамі *лясы, ласі.*

С. п. **3.** Прачытайце тэкст.



Лясныя жыхары добра падрыхтаваліся да зімы. Ваўкі, лісіцы, зайцы апранулі зімовае адзенне. Яшчэ да маразоў пачынаюць будаваць жыллё мядзведзі. У глыбокіх норках зімуюць вожыкі і мышы. Апусцелі птушыныя гнёзды. Толькі крыжадзюбы не баяцца маразоў. Усю зіму яны жывуць сярод снягоў, лушчаць шышкі. *Паводле Генадзя Скрабіцкага*

Спішыце. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў множнага ліку.

**крыжадзю́б**

Разгледзьце малюнак. Апішыце птушку. Чым яна адрозніваецца ад іншых зімуючых птушак? Раскажыце аб гэтым сваім сябрам у класе.

**4.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце да яго загаловак.

Маленькімі сонейкамі расцвілі дзьмухаўцы. Зялёныя пялёсткі, нібы маленькія далоні, трымаюць жоўтыя шары кветак. Днём яны песцяцца пад цёплымі промнямі сонейка, а ноччу спяць. Пройдзе час, пасівеюць дзьмухаўцы. Упрыгожацца яны белымі пушынкамі. Прабяжыць вецер, і паляцяць маленькія парашуцікі ў паветры. Апусцяцца на зямлю. На другі год зноў зацвітуць тут маленькія сонейкі.

Спішыце тэкст. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў у множным ліку.



Правообладатель Издательский центр БГУ

❓
1. Што такое назоўнік?
2. Па чым змяняюцца назоўнікі?
3. Як вызначыць склон назоўніка?
4. Прывядзіце прыклады назоўнікаў 1-га, 2-га і 3-га скланення.
5. Якія назоўнікі мужчынскага роду ў Р. склоне маюць канчаткі ***-у (-ю)***? Прывядзіце прыклады.

**23**

# НАЗОЎНІК

**1.** Прачытайце. Сярод аднакаранёвых слоў падкрэсліце назоўнікі, пастаўце да іх пытанні.

а) вырасці, расці, расліны, раслінны, расток
б) тлумачэнне, растлумачыць, тлумачальны
в) рыба, рыбак, рыбны, рыбіна, рыбачыць
г) голас, галасісты, галасаваць, галасок

Спішыце.

**2.** Прачытайце. Якімі членамі сказа з'яўляюцца назоўнікі?

Уся птушыная сям'я
вітае гул вясны.
*Максім Танк*

Гасцінна добры гаспадар
сваім святлом пакой чаруе.
*Станіслаў Шушкевіч*

Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

**3.** Прачытайце. Дапоўніце сказы адпаведнымі па сэнсе словамі з правага слупка.

Вучань добра выканаў граматычнае ... . — апавяданне
Наш клас збіраецца ў ... па родным краі. — чытанне


Правообладатель Издательский центр БГУ

Першым быў урок ... . | падарожжа
Мой сябар чытае цікавае ... . | заданне

Спішыце. Якімі членамі сказа з’яўляюцца назоўнікі? Падкрэсліце згодна ролі, якую яны выконваюць у сказе.

**4.** Знайдзіце ў кожным радзе «лішняе» слова паводле адносін да скланення.

а) дом, кажух, печ, чытач
б) агонь, даль, сябар, пень
в) сена, сцяна, надвор’е, брат
г) партфель, акно, вулей, чалавек

**24**

**1.** Прачытайце словы.

абшар, апавяданне, бульба, воблака, гора, дрэва, жыта, казка, колас, крыніца, легенда, месяц, мост, надвор’е, народ, поле, пшаніца, радасць, расліна, сонца, трава, тэлефон, шум, шчасце, шчэбет

Спішыце. Абазначце род назоўнікаў.

Складзіце і запішыце чатыры сказы з назоўнікамі 2-га скланення. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў.

**абша́р, самалёт, тэлефо́н**

**2.** Падбярыце пары слоў па ўзоры.

| | |
|---|---|
| *лета — дождж* | зіма — ... |
| *яхта — ветразь* | лодка — ... |
| *грыб — ножка* | дрэва — ... |
| *сталяр — дрэва* | каваль — ... |
| *вада — карабель* | паветра — ... |


Правообладатель Издательский центр БГУ

Словы для даведкі: *снег, вясло, ствол, жалеза, самалёт.* Запішыце пары слоў. Абазначце іх род і скланенне.

**3.** Прачытайце загадку. Адгадайце яе.

Круглы, як сонца,
Шыпіць пад ім донца.
Падрумяніцца бачок —
Скоціцца на ручнічок.

- Спішыце. Падкрэсліце назоўнікі 2-га скланення.
- Спішыце. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў 2-га скланення.
- Выпішыце назоўнікі 2-га скланення. Пастаўце да іх пытанні. Дапішыце яшчэ пяць назоўнікаў, якія адносяцца да 2-га скланення.

**4.** Якія загадкі вы ведаеце? Загадайце іх у класе сваім сябрам. Адну з іх запішыце.

---

**25**

**1.** Прачытайце.

Над лесам барвовым пажарам запалаў край неба. Сонца разліло сваё святло над полем і лугам. Ад вялікага клёна аддзяліўся залацісты лісток, пакружыўся ў паветры і бясшумна апусціўся на стылую зямлю.

Спішыце. Абазначце склон назоўнікаў.

**2.** Прачытайце сказы, якія запісаны па-руску. Перакладзіце іх на беларускую мову.

Наступила осень. Листья пожелтели и опадают на землю. Часто идёт дождь. Птицы улетают на юг.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Знайдзіце ў сказах назоўнікі. Падкрэсліце іх згодна ролі, якую яны выконваюць у сказе.

**3.** Прачытайце. Змяніце тэкст так, каб выдзеленыя назоўнікі былі ўжыты ў адзіночным ліку.

Восенню **птушкі** рыхтуюцца ў вырай. Па галінках скачуць чубатыя **сініцы**. З шумам пралятаюць **чародкі** драздоў. У лесе і полі сціхлі птушыныя **песні**. Доўгія і цяжкія **шляхі** чакаюць птушак.

Запішыце. Абазначце склон назоўнікаў.

**4.** Прачытайце скорагаворку.

Ішла скорагаворка са скорагаварчанятамі.

*Рыгор Барадулін*

Запішыце. Абазначце род і лік назоўнікаў.
Навучыцеся хутка гаварыць скорагаворку.

## НЕСКЛАНЯЛЬНЫЯ НАЗОЎНІКІ

26

Некаторыя назоўнікі не змяняюцца па склонах. Гэтыя назоўнікі называюцца **нескланяльнымі**. Запомніце іх: *метро, радыё, таксі, бюро, маці, атэлье, кафэ, кіно, паліто, кенгуру, шымпанзэ, піяніна, купэ, журы, Чылі, фае* і інш.

**1.** Складзіце словазлучэнні. Змяніце, дзе трэба, канчаткі назоўнікаў.

ехалі ў (аўтобус, метро), пайшоў да (сяброўка, маці), быў у (тэатр, кіно), месца ў (купэ, аўтобус), іграў на (піяніна, баян), убачыў у (фае, калідор), слухаў (радыё, песня)



Правообладатель Издательский центр БГУ

Словазлучэнні запішыце. Падкрэсліце нескланяльныя назоўнікі.

Нескланяльныя назоўнікі не змяняюцца па ліках і склонах, але адносяцца да аднаго з трох родаў.

Да мужчынскага роду адносяцца: назвы жывых істот (*шымпанзэ, кенгуру*), назвы гарадоў (*Баку*).

Да жаночага роду адносяцца назвы дзяржаў, рэк, гор, пустынь (*Чылі, Конга, Кіліманджара, Гобі*).

Да ніякага роду адносяцца нескланяльныя назоўнікі (*бюро, метро, паліто*), назвы азёр (*Антарыя*).

**2.** Прачытайце сказы. Абазначце род нескланяльных назоўнікаў.

Мы слухалі па радыё канцэрт вядомага спевака. З купэ выйшаў пасажыр. У музычнай школе я вучуся іграць на піяніна. У фае тэатра дзеці сустрэлі сваіх сяброў. Горад Баку — сталіца Азербайджана.

Спішыце. Абазначце род нескланяльных назоўнікаў.

**3.** Прачытайце словы. Растлумачце іх значэнне.

авеню, бра, Дэлі, журы, калібры, кіно, Конга, метро, паліто, поні, фламінга

Словы запішыце. Абазначце род нескланяльных назоўнікаў. Вусна складзіце тры сказы з назоўнікамі (на выбар).

**4.** Прачытайце тэкст.

Учора (у каго?) ў маці быў выхадны. Лена разам (з кім?) з маці пайшлі (у што? куды?) ў кіно. Лене вельмі хацелася



Правообладатель Издательский центр БГУ

паабедаць (у чым? дзе?) у кафэ. Маці згадзілася. Па дарозе яны зайшлі (у што? куды?) ў кафэ.

Спішыце. Падкрэсліце нескланяльныя назоўнікі.

**27**

На лік нескланяльных назоўнікаў паказваюць словы, якія іх паясняюць: *светлыя кафэ, маладыя кенгуру* (мн. л.).

**1.** Прачытайце. З выдзеленымі назоўнікамі складзіце сказы, ужываючы пры іх прыметнікі ў множным ліку.



Кіно, **какаду, піяніна**, таксі.

Сказы запішыце.

Склон нескланяльных назоўнікаў вызначаецца па сувязі іх з іншымі словамі ў сказе: *спыніўся каля купэ* (Р. с.), *накіраваўся ў купэ* (В. с.).

**2.** Прачытайце. Абазначце склон нескланяльных назоўнікаў.

У купэ вагона больш нікога не было. З купэ выйшлі два пасажыры. У Мінску пабудавалі метро. Яны сустрэліся ў метро. Праз прасторнае фае мы ўвайшлі ў залу. У фае я нечакана сустрэў Жэню з Палінай.

Спішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Назавіце некалькі нескланяльных назоўнікаў. З чатырма такімі назоўнікамі складзіце сказы. Сказы запішыце. Абазначце род нескланяльных назоўнікаў.

**4.** Прачытайце.

Учора яны атрымалі па радыё радасную вестку. На піяніна іграў выхаванец школы-інтэрната. Мая мама працуе ў атэлье. Мы выклікалі таксі і хутка былі на вакзале.

Спішыце. Абазначце склон нескланяльных назоўнікаў.

## 28

**1.** Разгледзьце малюнак.






1. Чаго прыехалі дзеці ў Мінск?
2. Якім транспартам яны карысталіся?
3. Як выглядае станцыя метро?
4. Куды затым паехалі дзеці?
5. Ці ўразіла іх метро і цырк? Чым?

Словы для даведкі: *метро, фае, паліто, поні, шымпанзэ, кафэ.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Складзіце вусна невялікае апавяданне «Паездка ў цырк». Запішыце.

**2.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце жывёл.







Складзіце і запішыце тры сказы па малюнках. Абазначце род нескланяльных назоўнікаў.

**кенгуру́, фламі́нга, шымпанзэ́**

---

**29**

**1.** Прачытайце верш.



**Залатыя дзьмухаўцы**

Зелянінай луг буяе,
Дзьмухаўцамі расцвітае.
Ой, якія малайцы —
Залатыя дзьмухаўцы!
Быццам пырскі сонца ззяюць,
«Лета блізка!» — нагадаюць.
Прыйдуць светла
Услед за імі



Правообладатель Издательский центр БГУ

І рамонкі,
І валошкі,
І званочкі,
І смалянкі
На ўзмежкі,
На палянкі. *Таццяна Мушынская*

● Выпішыце назоўнікі множнага ліку, выдзеліце іх канчаткі і абазначце склон.

● Выпішыце назоўнікі множнага ліку і пастаўце іх у Р. склоне па ўзоры: *дзьмухаўцы* — (чаго?) *дзьмухаўцоў*.

● Выпішыце назоўнікі множнага ліку, выдзеліце іх канчаткі. Пастаўце іх у Р. і В. склонах. Зрабіце вывад.

**Успомніце.** У Н. склоне множнага ліку назоўнікі маюць канчаткі **-ы (-і), -е**: *сосн[ы], брат[ы], вучн[і], берагі[і], мінчан[е]*.
У Р. склоне множнага ліку назоўнікі маюць канчаткі ***-оў (-ёў), -аў (-яў), -ей (-эй)*** і нулявы канчатак: *гус[ей], дажадж[оў], лас[ёў], рук[ ], ног[ ], дарог[ ]*.
Канчаткі В. склону множнага ліку залежаць ад пытання, на якое адказвае назоўнік:
калі назоўнікі адказваюць на пытанне *што?*, іх канчаткі супадаюць з канчаткамі Н. склону: *паставілі стал[ы], пасадзілі дрэв[ы]*;
калі назоўнікі адказваюць на пытанне *хто?*, іх канчаткі супадаюць з канчаткамі Р. склону: *павіншавалі вучн[яў], даглядае цылят[ ]*.

**2.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму. Прыдумайце загаловак.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Дзікія качкі селяцца па берагах рэк і азёр. Яны ўюць сабе гнёзды сярод кустоў і добра хаваюць іх. У зарасніках высокіх траў гнёздаў не відаць. Восенню качкі збіраюцца ў чароды і ляцяць у вырай.



Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў множнага ліку.

С. п. **3.** Прачытайце сказы. Назоўнікі, што ў дужках, пастаўце ў множным ліку і патрэбным склоне.

Шумяць пад ветрам (*ліпа, бяроза, клён, дуб*). Падаюць жоўтыя лісты з (*ліпа, бяроза, клён, дуб*). Нашы лясы ўпрыгожваюць (*ліпа, бяроза, клён, дуб*). Пажаўцелі (*луг, поле, лес*). Нельга ўявіць наш край без шырокіх (*луг*), бяскрайніх (*поле*), велічных (*лес*).

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў множнага ліку.

**4.** Падбярыце пары слоў па ўзоры.

| | |
|---|---|
| *зіма — лыжы* | лета — ... |
| *настаўнік — вучні* | афіцэр — ... |
| *бярозы — гай* | яблыні — ... |
| *гадзіна — мінуты* | тыдзень — ... |
| *дуб — жалуды* | жыта — ... |

Запішыце. Пастаўце (вусна) назоўнікі множнага ліку ў Р. і В. склонах.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## 30

**1.** Прачытайце верш.

Урадзіла бульба
на сялянскім полі,
гэткай добрай бульбы
не было ніколі.

Мы яе капаем,
у бурты складаем.
Сёстрам, мамам, бабкам
мы дапамагаем.

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Абазначце склон назоўнікаў множнага ліку.

Назоўнікі ў Д. склоне множнага ліку маюць канчаткі ***-ам (-ям)***: *вятрам, гасцям, сёстрам, бабулям*. Ужываюцца з прыназоўнікамі ***па, насустрач, услед***.

**2.** Прачытайце тэкст.

Холад і голад пагражаюць насякомым і дзікім жывёлам узімку. Настаўніца расказала вучням, як можна дапамагчы птушкам перажыць зімнія халады. Дзеці дамовіліся змайстраваць кармушкі. Сінічкам, снегірам і вераб'ям спадабаюцца птушыныя сталоўкі. Птушкі будуць удзячны сваім сябрам.

- Спішыце. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў множнага ліку.
- Выпішыце назоўнікі множнага ліку па ўзоры: *пагражаюць* (каму?) *насякомым і жывёлам*.
- Пастаўце назоўнікі *вучні, сябры, людзі* ў Д. склоне. Складзіце з імі тры сказы. Сказы запішыце.

С. п. **3.** Прачытайце словы. Пастаўце іх у Д. склоне множнага ліку.



Правообладатель Издательский центр БГУ

берег — берагі, брат — ..., дождж — ..., мора — ..., рака — ..., снег — ..., сын — ..., холад — ...

● Запішыце назоўнікі ў Д. склоне. Выдзеліце канчаткі.

● Запішыце тры назоўнікі ў Д. склоне. Складзіце і запішыце словазлучэнні па ўзоры: *зайздросціў* (каму?) *брату*.

● Складзіце і запішыце чатыры сказы з назоўнікамі множнага ліку ў Д. склоне.

**4.** Прачытайце тэкст.

Каля школы растуць ліпы. Гэтым дрэвам амаль сто гадоў. Птушкі спяваюць старым дрэвам песні. Вятры расказваюць ліпам свае казкі. Хмары нясуць прыгажуням дажджы. Моцныя завеі гнуць іх галіны. Маразы ахутваюць іх серабрыстым інеем. Многае перажылі на сваім вяку ліпы.

Спішыце тэкст. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон назоўнікаў множнага ліку.

**31**

**1.** Прачытайце словы. Пастаўце іх у Т. склоне.

вокны, госці, даліны, дзеці, песні, сябры

Запішыце назоўнікі ў Т. склоне. Выдзеліце канчаткі. Вусна складзіце з імі сказы.

Назоўнікі ў Т. склоне множнага ліку маюць канчаткі ***-амі (-ямі)***: *вокнамі*, *пеcнямі*.

Некаторыя назоўнікі множнага ліку ў Т. склоне маюць канчатак ***-мі***: *коньмі*, *дзецьмі*.

Ужываюцца з прыназоўнікамі ***з, за, над, пад, перад, паміж.***



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце сказы.

1. Над канавамі вісяць зябкія палоскі туману. 2. Неба зацягнулася хмарамі, і пайшоў дождж. 3. Невялічкая палянка была ўсыпана ягадамі. 4. Пад старымі дубамі было шмат жалудоў.

Спішыце. Абазначце склон назоўнікаў множнага ліку.

**3.** Прачытайце сказы.

Пад **соснамі, дубамі, бярозамі, ліпамі** адчуваўся прыемны халадок. Над **званочкамі, рамонкамі, смолкамі** мітусіліся рознакаляровыя матылькі. Дзеці вярталіся з лесу з **лісічкамі, падасінавікамі, маслякамі**.

Пры спісванні замяніце выдзеленыя словы адным, якое абазначае агульную назву прадметаў.

Узор: *Над зацвіўшымі* ***вішнямі, чарэшнямі, слівамі*** *гудзелі пчолы. — Над зацвіўшымі* ***дрэвамі*** *гудзелі пчолы.*

**4.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце іх у Т. склоне.

белакрылыя буслы, героі беларускай зямлі, моцныя пахі, прыемныя гукі, светлыя колеры

Складзіце і запішыце з імі 2—3 сказы. Адзін з іх (на выбар) разбярыце па членах сказа.

## 32

**1.** Прачытайце словы. Змяніце іх па ўзоры. Выкарыстоўвайце прыназоўнікі ***у, на, аб, па, пры***.

Узор: *слова — словы — у словах.*

верабей, вядро, гняздо, завод, колас, конь, поле, тэатр, фабрыка, ферма, экскурсія



Правообладатель Издательский центр БГУ

Запішыце. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў у М. склоне, падкрэсліце прыназоўнікі.

Назоўнікі ў М. склоне множнага ліку маюць канчаткі ***-ах (-ях)***: *у садах*, *у песнях*. Ужываюцца з прыназоўнікамі ***у, на, аб, па, пры***.

**2.** Прачытайце словазлучэнні. Назавіце канчаткі назоўнікаў множнага ліку.

растуць у сад.., збіраюць на пал.., трымаць у далон.., бегаюць па сцяжынк.., марыць аб дал.., былі ў гасц.., вучацца ў школ.., працуюць на завод.. і фабрык.., падарожнічаць па мясцін..

Словазлучэнні запішыце. Выдзеліце канчаткі. Вусна складзіце некалькі сказаў.

С. п. **3.** Прачытайце тэкст. Назавіце канчаткі назоўнікаў множнага ліку.

**На канікулах**

Віця прыехаў на канікулы да бабулі. Вёска знаходзіцца ў маляўнічых мясцін.. .

Адразу за сад.. пачынаецца зялёны луг. Далей ідуць шырокія палетк.. бульбы. За імі раскінуліся бязмежныя каласістыя нів.. . За пал.. ўзвышаецца шчыльная сцяна бору. З вясковымі хлапчук.. Віця будзе хадзіць у грыб.. і ягад.. .

Раздолле летам у беларуск.. вёск.. !

• Запішыце. Устаўце патрэбныя канчаткі назоўнікаў множнага ліку. Выдзеліце іх.



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Запішыце. Устаўце патрэбныя канчаткі назоўнікаў множнага ліку. Абазначце склон і выдзеліце канчаткі гэтых назоўнікаў.

• Напішыце 4—5 сказаў аб тым, як вы праводзіце летнія канікулы. Выкарыстайце назоўнікі множнага ліку. Абазначце іх склон.

**4.** Прачытайце верш.

На рэках, азёрах і нівах,
заводах, будоўлях — наўсцяж
народ наш працуе руплівы,
і край узвышаецца наш.

Мы дружбы народам жадаем
і шчырай братэрскай любві.
Радзіма мая дарагая,
красуйся і ў шчасці жыві!

*Алесь Бачыла*

Запішыце першы слупок па памяці, выдзеліце канчаткі назоўнікаў множнага ліку.

**33**

**1.** Разгледзьце малюнкі. Паразважайце над іх зместам. Якія з іх можна аб'яднаць адной тэмай?







Правообладатель Издательский центр БГУ





**2.** Дапішыце канчаткі, вызначце склон назоўнікаў.

Плысці на лодц.., на параходз.. .
Працаваць у пол.., на трактар.. .
Пасадзілі ў лес.., на градц.. .
Спявалі аб Радзім.., аб геро.. .
Ляцець над акіян.., над лес.. .

Запішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон.

**акія́н**

# ПРЫМЕТНІК

34

**1.** Прачытайце ўрывак з верша.

**Залаты хлеб**

Паважаем белы хлеб!
Паважаем чорны!
Мы збіраем ураджай —
залатыя зёрны.

Мы збіралі ўраджай
залацісты, спелы...
Ох і смачны чорны хлеб!
Ох і смачны белы!

*Роберт Мінулін*



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Спішыце. Падкрэсліце словы, якія адказваюць на пытанні *які? якая? якое? якія?*

• Выпішыце словазлучэнні «назоўнік + прыметнік» па ўзоры: *хлеб* (які?) *белы*.

• Складзіце са словазлучэннямі новыя сказы. Падкрэсліце прыметнікі.

**Успомніце.** Прыметнік — гэта часціна мовы, якая называе прыметы прадметаў і адказвае на пытанні *які? якая? якое? якія? чый? чыя? чыё? чые?*
У сказе прыметнікі звязаны з назоўнікамі.
Прыметнікі надаюць мове дакладнасць, яркасць, выразнасць.

**2.** Прачытайце тэксты. Параўнайце апісанні коціка.

### Васька

Коцік-каток Васька. У Ваські вушкі, вусы, футра. Лашчыцца кот, выгінаецца, вочы закрывае, песеньку спявае. А папалася мышка — не гневайся. Бо ў Ваські вочкі, лапкі, зубкі, кіпцюры заўсёды нагатове.

### Васька

Коцік-каток — шэранькі лабок. Ласкавы Васька, ды хітры. Лапкі ў яго аксамітныя, кіпцюры вострыя. У Ваські вушкі чуйныя, вусы доўгія, футра шаўковае. Лашчыцца кот, выгінаецца, вочы закрывае, песеньку спявае. А папалася мышка — не гневайся. Бо вочкі вялікія, лапкі стальныя, зубкі вострыя, кіпцюры выпускныя.

*Паводле Канстанціна Ушынскага*

Які тэкст больш дакладна і выразна апісвае ката?



Правообладатель Издательский центр БГУ

Якія словы дапамагаюць нам больш яскрава ўявіць ката? Назавіце іх.

Паспрабуйце намаляваць такога ката, якім апісаў яго Канстанцін Ушынскі.

С. п. **3.** Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх «лішняе».

салодкі, гаркавы, шкляны, салёны, кіслы
шэрае, бэжавае, нізкае, зялёнае, ружовае
вузкая, доўгая, кароткая, шакаладная, круглая

Складзіце і запішыце тры сказы з «лішнімі» словамі-прыметнікамі.

**4.** Прачытайце прыметнікі. Падбярыце да іх словы з супрацьлеглым значэннем.

| | | |
|---|---|---|
| ветлівы — ... | надзейны — ... | настойлівы — ... |
| ласкавы — ... | добры — ... | шчыры — ... |

Запішыце пары слоў. Вусна складзіце з адной парай (на выбар) сказы.

**35**

## ЗМЯНЕННЕ ПРЫМЕТНІКАЎ ПА РОДАХ, ЛІКАХ І СКЛОНАХ

**Успомніце.** Прыметнікі змяняюцца па ліках і склонах, а ў адзіночным ліку — і па родах.
Прыметнік звязаны з назоўнікам і стаіць у тым жа родзе, ліку і склоне, што і назоўнік.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Складзіце сказы. Выберыце патрэбныя прыметнікі.

1. Надыходзіць (*доўгачаканая, снежная, суровая, вясёлая*) зіма. 2. (*Яркае, цёплае, далёкае, нізкае*) сонца свеціць, але не грэе. 3. Ляжаць (*рознакаляровым, цёплым, тоўстым*) дыванам лісты пад дрэвамі і кустамі. 4. Адцвілі і завялі (*маленькія, прыгожыя, духмяныя*) кветкі.

Сказы запішыце. Падкрэсліце прыметнікі. Вусна вызначце іх лік і род.

**2.** Прачытайце радкі з верша.

Ноч, як сон, прыгожая
Стала над акном.
Зззяе сцежка вузкая
Ясным серабром.

Вузкаю палоскаю
На краі нябес
Лёг за нашай вёскаю
Старадаўні лес.

*Янка Купала*

• Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі. Абазначце іх род і лік.

• Выпішыце словазлучэнні па ўзоры: *ноч* (якая?) *прыгожая* — ж. р., адз. л. Абазначце род і лік прыметнікаў.

• Прыдумайце і запішыце свае прыметнікі да назоўнікаў *ноч, сцежка, серабро, лес*. Абазначце іх род, лік і склон.

**3.** Да прыведзеных прыметнікаў падбярыце як мага больш назоўнікаў і складзіце словазлучэнні.

вострЫ, гарачы, мяккі, родны, светлы, цяжкі

Узор: *высокі: высокі будынак, высокая трава, высокае званне, высокі голас, высокая пасада, высокае дрэва, высокія гукі.*

Словазлучэнні запішыце. Вусна вызначце лік і род прыметнікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце сказы. Пастаўце словазлучэнні ў патрэбным родзе, ліку і склоне.

1. Над (*жытнёвае поле*) і (*зялёны лес*) адыходзіў (*чысты летні дзень*). 2. Пахла зямля (*прэлае лісце*), (*сухое сена*), (*гнілое балота*). 3. Не сядзіцца ў хаце (*хлопчык малы*). 4. На (*чорнае поле*) (*белая пшаніца*) родзіць.

Спішыце. Абазначце род і лік прыметнікаў.

---

**36**

**1.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце да яго загаловак.

Надышоў мой дзень нараджэння. Я запрасіў гасцей. Маці купіла шакаладны торт на пачастунак.

Вось і прыйшлі госці. І ўсе з падарункамі. Колька, мой сусед, мне настольную гульню «Хакей» прынёс.

— Дзякуй, — кажу я Колю. — Праўда, я не вельмі люблю гэту гульню. Мне больш падабаецца «Футбол» або лато.

Віця прынёс мне беларускія народныя казкі.

— Дзякуй, — кажу я, — кніжка цудоўная. Гэта нічога, што яна не новая. Відаць, усе твае знаёмыя перачыталі...

Ліля, аднакласніца, падаравала мне набор фламастараў.

— Вось добра, — кажу я. — Мне якраз патрэбны фламастары. Шкада толькі, што тут усяго шэсць колераў. Асабліва не размалюешся. Вось у магазіне я бачыў — васямнаццаць колераў!

Паклаў я падарункі і запрасіў гасцей да стала. Пачаў дзяліць торт і чай разліваць. Гляджу — а госці мае невясёлыя. Калупаюць торт і маўчаць. Потым развіталіся і дамоў пайшлі. І чым я ім не дагадзіў? Мусіць, торт быў нясмачны.

*Аляксандр Саўчук*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Як вы думаеце, чаму госці разышліся невясёлымі?

Калектыўна складзіце план апавядання і запішыце яго. Перакажыце апавяданне па плане. Пераказ вядзіце ад імя аўтара.

Пачніце пераказ так:

Вася запрасіў гасцей на свой дзень нараджэння. Мама купіла торт на пачастунак...

**2.** Прачытайце прыметнікі. Падбярыце да іх назоўнікі.

сонечны, вясёлы, цёплы ...
слабы, вушасты, палахлівы ...
свежае, сухое, духмянае ...
сціплыя, выхаваныя, адукаваныя ...

Вусна вызначце род і лік прыметнікаў.

## 37

**1.** Дапішыце канчаткі прыметнікаў, вызначце іх лік і род.

чыст.. бераг, летн.. гром, сцюдзён.. вада, халодн.. надвор’е, пералётн.. птушкі, моцн.. завеі, векав.. пушча, снежн.. заносы

**2.** Прачытайце верш.

### У лесе

Пад снежнай пярынай
сцяжынкі крывыя,
агні журавінаў
і кветкі лясныя.

А елкі кашлатыя,
сосны, бярозы
пакрыліся ватай
ад лютых марозаў.

*Уладзімір Карызна*

Запішыце. Абазначце род, лік і склон прыметнікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Прачытайце.

Сярод поля рос стары дуб. Старому дубу не страшныя навальніцы. На старым дубе гняздзяцца буслы. Увосень пад старым дубам дзікі збіраюць жалуды.

Запішыце. Абазначце склон і род прыметнікаў у сказах.

**4.** Дапішыце да назоўнікаў прыметнікі. Вызначце іх лік і род.

поле (якое?) …  
зіма (якая?) …  
вецер (які?) …  
сябры (якія?) …

38

## СКЛАНЕННЕ ПРЫМЕТНІКАЎ

**1.** Прачытайце. Звярніце ўвагу на канчаткі прыметнікаў у Н., Р., В. склонах.

**Адзіночны лік**

Н. с. (які?) *шырок**і*** (луг), (якая?) *шырок**ая*** (рака), (якое?) *шырок**ае*** (поле)

Р. с. (якога?) *шырок**ага*** (луга), (якой?) *шырок**ай*** (ракі), (якога?) *шырок**ага*** (поля)

Д. с. (якому?) *шырок**аму*** (лугу), (якой?) *шырок**ай*** (рацэ), (якому?) *шырок**аму*** (полю)

В. с. (які?) *шырок**і*** (луг), (якую?) *шырок**ую*** (раку), (якое?) *шырок**ае*** (поле)

Т. с. (якім?) *шырок**ім*** (лугам), (якой?) *шырок**ай*** (ракой), (якім?) *шырок**ім*** (полем)

М. с. (аб якім?) *шырок**ім*** (лузе), (аб якой?) *шырок**ай*** (рацэ), (аб якім?) *шырок**ім*** (полі)



Правообладатель Издательский центр БГУ

### Множны лік

Н. с. (якія?) *шырок**ія*** (прасторы), (якія?) *пералётн**ыя*** (птушкі)

Р. с. (якіх?) *шырок**іх*** (прастораў), (якіх?) *пералётн**ых*** (птушак)

Д. с. (якім?) *шырок**ім*** (прасторам), (якім?) *пералётн**ым*** (птушкам)

В. с. (якія?) *шырок**ія*** (прасторы), (якіх?) *пералётн**ых*** (птушак)

Т. с. (якімі?) *шырок**імі*** (прасторамі), (якімі?) *пералётн**ымі*** (птушкамі)

М. с. (аб якіх?) *аб шырок**іх*** (прасторах), (аб якіх?) *аб пералётн**ых*** (птушках)

Параўнайце канчаткі прыметнікаў і канчаткі пытанняў.
Якога роду прыметнікі скланяюцца аднолькава?

**2.** Праскланяйце (вусна) словазлучэнні.

стройны ясень, стройная бяроза, стройнае дрэва, стройныя сосны

Карыстайцеся ўзорам скланення з папярэдняга практыкавання.

Складзіце 2—3 сказы са словазлучэннямі (на выбар). Сказы запішыце.

**Вучыцеся распазнаваць!**

Для таго каб вызначыць склон прыметнікаў у сказе, трэба:
1) знайсці назоўнік, з якім звязаны прыметнік;
2) вызначыць склон назоўніка;
3) ад назоўніка паставіць пытанне да прыметніка і па склоне назоўніка вызначыць склон прыметніка.



Правообладатель Издательский центр БГУ

*Люблю я прыволле шырокіх палёў, зялёнае мора жытнёвых каласоў.* (Якуб Колас)
*люблю* (што?) *мора* (якое?) *зялёнае* — В. с.
*мора* (чаго?) *каласоў* (якіх?) *жытнёвых* — Р. с.

**3.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце назоўнікі і звязаныя з імі прыметнікі.

Алесь ішоў высок.. берагам возера. Раптам вузеньк.. дарожка пакацілася з узгорка ўніз. Перад вачыма раскінулася бязмежн.. сенажаць, як бы разаслаў хто вялізн.. дыван, што зліваўся ўдалечыні з блакітн.. шоўкам чэрвеньск.. неба.

Запішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склоны прыметнікаў.


**4.** Прачытайце пісьмо вучаніцы пятага класа, якое яна напісала ў газету.

У гэтым годзе ў наш клас прыйшоў новы хлопчык. У яго, напэўна, часта дрэнны настрой. Хлопчык адчувае сябе чужым. На перапынках навічок заўсёды стаіць каля акна. А вочы ў яго сумныя-сумныя. Хлопчык стаіць і назірае за вучнямі, якія гуляюць, смяюцца. Калі-нікалі мне здаецца, што яму таксама хочацца пагуляць з дзецьмі. Вучань нават робіць крок наперад, але потым ізноў адыходзіць да акна. Відаць, ён баіцца падысці і першым загаварыць з кім-небудзь. Як зрабіць, каб яму было ў нашым класе добра?

Што б вы параілі вучаніцы пятага класа і яе аднакласнікам?


Правообладатель Издательский центр БГУ

Ці была ў вашым класе падобная сітуацыя? Як вы яе вырашылі? Падзяліцеся думкамі.

Палічыце, колькі прыметнікаў у гэтым тэксце. Ці дапамагаюць яны выразіць асноўную думку тэксту? Дакажыце.

**5.** Прачытайце тэкст. Пастаўце прыметнікі ў патрэбным ліку, родзе і склоне.

**Раніца**

Ранішн.. сонейка паказалася з-за густ.. лесу. Пад промнямі ярк.. сонца ажылі прыгож.. кветкі. Радасна вітаюць нов.. дзень птушкі. Зазвінелі ў небе вясёл.. жаваранкі. Замітусіліся працавіт.. шпакі. Нізка над зямлёй праляцелі імкліў.. ластаўкі. Паляцелі на квяціст.. луг руплів.. пчолкі. Пачаўся працоўн.. дзень.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў. Карыстайцеся табліцай.

Да слова *імклівыя* вусна падбярыце словы з блізкім значэннем.

**39**

## ПРАВАПІС СКЛОНАВЫХ КАНЧАТКАЎ ПРЫМЕТНІКАЎ МУЖЧЫНСКАГА І НІЯКАГА РОДУ

### НАЗОЎНЫ І ВІНАВАЛЬНЫ СКЛОНЫ

**1.** Прачытайце сказы. Абазначце склон прыметнікаў.

1. Школьнікі пасадзілі малады сад. 2. Вясной малады сад упрыгожвае наваколле. 3. Сіняе неба пакрылася хмарамі. 4. Хмары закрылі сіняе неба. 5. Ёсць на Беларусі прыгожае



Правообладатель Издательский центр БГУ

возера Нарач. 6. Мы прыехалі адпачываць на прыгожае возера Нарач.

Прыметнікі мужчынскага роду ў Н. склоне маюць канчаткі ***-ы (-і)***: *добр*[ы], *смел*[ы], *дарагі*[і], *мякк*[і].

Калі прыметнік мужчынскага роду ў В. склоне адносіцца да назоўніка, які адказвае на пытанне *каго?*, то пішацца канчатак ***-ага (-яга, -ога)***: *добр*[ага], *бліжн*[яга], *дараг*[ога].

Калі прыметнік мужчынскага роду ў В. склоне адносіцца да назоўніка, які адказвае на пытанне *што?*, то пішацца канчатак ***-ы (-і)***: *добр*[ы], *дараг*[і].

Прыметнікі ніякага роду ў Н. і В. склоне ўжываюцца з канчаткамі ***-ое*** пад націскам, ***-ае (-яе)*** — не пад націскам: *дараг*[ое], *добр*[ае], *ранн*[яе].

**2.** Прачытайце. Назавіце канчаткі прыметнікаў у Н. і В. склонах.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. с., В. с. | які? якое? | *родн*□ дом | *сін*□ небасхіл |
| | | *родн*□ слова | *сін*□ мора |
| | | *добр*□ надвор'е | *дараг*□ падарунак |

Выдзеліце канчаткі і склон прыметнікаў.

**3.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце іх у В. склоне.

высокі прыгожы дом, дарагі родны чалавек, жывое шчырае сэрца, шырокае прыгожае возера, ціхі летні вечар

• Запішыце словазлучэнні ў В. склоне. Выкарыстайце пры магчымасці прыназоўнікі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Складзіце і запішыце сказы з дадзенымі словазлучэннямі ў В. склоне. Абазначце склон прыметнікаў.

• Падбярыце да слоў *надвор'е, мароз* прыметнікі. Пастаўце іх у В. склоне. Складзіце два сказы. Запішыце іх. Абазначце склон прыметнікаў.

Каб адрозніць Н. склон прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду ад В. склону, трэба вызначыць склон назоўніка, з якім звязаны гэты прыметнік.

Можна таксама замяніць гэты назоўнік назоўнікам жаночага роду: *убачыў птушынае гняздо — убачыў птушыную чараду* (В. с.), *ляціць птушынае пяро — ляціць птушыная чарада* (Н. с.).

**4.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.

Нос вусаты,
Лоб паласаты,
Хвосцік пушысты,
Сам кіпцюрысты.

Люстэрка чыстае і глыбокае
Сіняе неба ў сабе адбівае,
Смагу здымае.

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі. Абазначце іх склон.

**40**

## РОДНЫ СКЛОН

Р. с. якога? *роднага* (чалавека), *залатога* (коласа)
*сіняга* (неба), *летняга* (дня)

**ко́мплекс**

**1.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце назоўнікі і прыметнікі ў Р. склоне.



Правообладатель Издательский центр БГУ

духмяны хлеб, бацькоўскі наказ, шырокі далягляд, спартыўны комплекс, высокі гатунак, залаты пярсцёнак, злы звер, жытні колас, летняе надвор'е

Словазлучэнні запішыце. Вусна складзіце з імі некалькі сказаў.

У Р. склоне канчатак ***-ога*** пішацца толькі пад націскам: *малад[ога] чалавека, ляcн[ога] звера.*

Не пад націскам пішуцца канчаткі ***-ага (-яга)***: *бел[ага] снегу, сін[яга] возера, ранн[яга] часу.*

**2.** Прачытайце словазлучэнні парамі. Параўнайце іх значэнні.

залаты пярсцёнак — залаты чалавек
свежы хлеб — свежае паветра
мяккі снег — мяккі голас

Растлумачце пераносны сэнс прыметнікаў. Складзіце сказы. Выкарыстайце прыметнікі ў Р. склоне. Сказы запішыце.

**3.** Прачытайце сказы. Прыметнікі, што ў дужках, пастаўце ў патрэбным склоне.

1. Верасень штогод запрашае нас з (*летні*) адпачынку ў любімы клас. 2. Дрэвы гнуцца ад (*моцны халодны*) ветру. 3. На беразе (*глыбокае*) возера раслі старыя вербы. 4. З (*прышкольны*) ўчастка вучні сабралі добры ўраджай агуркоў. 5. Улетку з самага рання да (*позні*) вечара гудуць пчолы на лугах.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Сказы запішыце. Абазначце склон прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку.

**4.** Прачытайце сказы. Прыметнікі, што ў дужках, стаўце ў патрэбным склоне.

1. Луста (*жытні*) хлеба, брат, нялёгка дастаецца. (*Якуб Колас*) 2. Пасыпаўся снег мільёнамі камячкоў (*дробны мяккі*) пуху. (*Якуб Колас*) 3. З (*вялікі*) грому малы дождж бывае. 4. На (*добры*) пытанне (*добры*) і апавяданне.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.

**ашча́дны, люстэ́рка**

**41**

## ДАВАЛЬНЫ СКЛОН

Д. с. якому? *роднаму* (краю)
*дарагóму* (брату)
*сіняму* (небу)
*летняму* (дню)

У Д. склоне канчатак ***-óму*** пішацца пад націскам: *маладóму саду*; ***-аму (-яму)*** пішуцца не пад націскам: *стараннаму* (*вучню*), *бліжняму* (*суседу*).

**1.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце іх у Д. склоне.

сасновы лес, беленькі грыбок, жытнёвае поле, стракаты дзяцел, спелы колас, глыбокі калодзеж, лясное возера, летні ранак, чароўнае люстэрка, ашчадны чалавек



Правообладатель Издательский центр БГУ

Запішыце словазлучэнні. Вусна складзіце з імі некалькі сказаў.

**2.** Складзіце словазлучэнні з прыметнікамі ў Д. склоне.

прачытаць (каму?), прысвечаны (чаму?), аддаць (каму?), кланяцца (каму?), радавацца (чаму?)

Словы для даведкі: *яснае неба, старэйшы брат, летняе сонца, урачыстае свята, маленькая дзяўчынка, стары дзед*.

Словазлучэнні запішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў.

**3.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце яму загаловак.

Дзеці былі ў турысцкім паходзе. Яны начавалі ў палатцы. Ноччу дзеці пачулі ціхі шоргат. Усе прыслухаліся. Шоргат не змаўкаў. Хлопчыкі пачалі шукаць, што шаргоча, але нічога не знайшлі. Перанеслі палатку на новае месца. Зноў шоргат. Перабралі рэчы. З рукзака выпаў на траву вялікі жук-алень. Лясному велікану не спадабалася ў рукзаку, і ён хацеў выбрацца на волю.

Жук-алень вельмі прыгожы. У нашых лясах ён сустракаецца вельмі рэдка. Знішчаць яго забаронена.



Выпішыце словазлучэнні «назоўнік + прыметнік», выдзеліце канчаткі прыметнікаў.

А вы былі калі-небудзь у турысцкім паходзе? Якія цікавыя здарэнні адбыліся там? Раскажыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце тэкст. Пастаўце прыметнікі з назоўнікамі ў патрэбным склоне.

### Завіруха

Разгулялася завіруха. Здавалася, канца не будзе яе (*злоснае завыванне*). (*Маленькі хлопчык*) чулася за акном невядомая песня. Дрэвы падстаўлялі насустрач (*раз'юшаны вецер*) свае гнуткія галіны. Яны нібы хацелі загарадзіць шлях (*снежны буран*).

*Паводле Якуба Коласа*

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.

**42**

## ТВОРНЫ І МЕСНЫ СКЛОНЫ

Прачытайце. Звярніце ўвагу на канчаткі прыметнікаў.

Т. с. якім? *дрымуч[ым]* (лесам), *высок[ім]* (дубам)
М. с. у якім? *у нов[ым]* (доме), *у сін[ім]* (небе)

**1.** Прачытайце верш. Устаўце канчаткі прыметнікаў. Вызначце іх склон.

Калі рана ўстанеш —
разам з сонцам ярк..,
разам з ветрам шпарк..,
разам з бел.. днём, —
сам тады, мой дружа,
разумець ты будзеш,
для чаго мы, людзі,
на зямлі жывём.

*Ніл Гілевіч*

• Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў. Вусна пастаўце пытанні.



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Выпішыце словазлучэнні «назоўнік + прыметнік». Вусна пастаўце пытанні. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон.

• Складзіце і запішыце новыя сказы са словазлучэннямі ў Т. склоне.

**2.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце іх у М. склоне. Выкарыстайце прыназоўнікі.

дрымучы лес, свежы хлеб, яркі прамень, густы мох, пякучае сонца, разумны чалавек, новы аэрадром, цікавае здарэнне, прыемнае слова, сцюдзёны дзень

**сцюдзёны, аэрадро́м**



Словазлучэнні запішыце па ўзоры: *цёплы дзень — аб цёплым дні.*

Выдзеліце канчаткі.

> Прыметнікі мужчынскага і ніякага роду ў Т. і М. склонах маюць канчаткі ***-ым (-ім)***: *маладым (чалавекам), аб маладым (чалавеку), над ціхім (возерам), у ціхім (возеры).*

**3.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Прыдумайце загаловак.

Зімовы лес выглядае маўклівым. Але так толькі здаецца. Ён жыве сваім жыццём. Цяжка ўзнімаецца над белым кустом спалоханы цецярук. Прамільгне вясёлы снягір у пярэстым



Правообладатель Издательский центр БГУ

убранні. Дробна стукае аб сухое дрэва працавіты дзяцел. Абуджаецца наваколле рэзкім крыкам савы. Птушыны гоман ажыўляе ціхі лес ва ўсе поры года.

*Паводле Алеся Якімовіча*

Выпішыце прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Абазначце іх род і склон.

Узор: *лес* (які?) *зімовы* — м. р., Н. с.

**4.** Якую памылку вы заўважылі?

Алене патрэбна было тэрмінова звярнуцца да настаўніцы, але тая размаўляла з іншай настаўніцай. Алена падбегла да іх і сказала:

— Ніна Іванаўна...

Што б вы параілі дзяўчынцы? Падзяліцеся думкамі. Правядзіце гульню-дыялог.

**5.** Праскланяйце словазлучэнні.

родны бацькоўскі дом, спелае залатое збожжа

Абазначце канчаткі.

## 43

**1.** Разгледзьце малюнкі на с. 77, складзіце па іх апавяданне. Якая ў ім асноўная думка? Прыдумайце загаловак.

Якія правілы дарожнага руху павінен ведаць кожны чалавек?

Апавяданне запішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ







**2.** Прачытайце словы. Падбярыце да іх словы з супрацьлеглым значэннем.

малады — …
сумны — …
глыбокі — …
сыты — …

мокры — …
горкі — …
здаровы — …
баязлівы — …

Складзіце з дзвюма парамі слоў (на выбар) сказы. Выкарыстайце прыметнікі ў В. склоне.

**44**

**1.** Пастаўце ў дужках пытанні да прыметнікаў, выдзеліце канчаткі, абазначце склон.

Адказ (...?) дакладны.
З неба (...?) хмарнага.
У моры (...?) цёплым.
Брату (...?) роднаму.
З дакладам (...?) цікавым.

Запішыце.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Пастаўце адпаведныя прыметнікі ў патрэбным склоне. Вызначце канчаткі і склон.

Вечар у школе прысвечаны (якому?) ... святу. Усе рады (якому?) ... дню, (якому?) ... сонцу. Прырода радуецца (якому?) ... світанню.

Словы для даведкі: *святочны, яркае, яснае, навагодняе*.

Запішыце.

**3.** Са слоў кожнага радка складзіце сказы. Выдзеліце канчаткі і склон прыметнікаў.

у, возеры, уюны, ціхім, водзяцца, лясным
серабрыстым, палі, інеем, і, сенажаці, пакрыты, былі
на, лету, восень, змену, цёпламу, прыйшла
са, сабралі, школьнага, багаты, саду, ураджай

Запішыце.

**4.** Пастаўце назоўнікі з прыметнікамі ў Р. склоне:

глыбокае празрыстае блакітнае возера, цёмнае зорнае летняе неба

у М. склоне:

новы чысты вучнёўскі сшытак, высокі гонкі малады клён



Правообладатель Издательский центр БГУ

# ПРАВАПІС СКЛОНАВЫХ КАНЧАТКАЎ ПРЫМЕТНІКАЎ ЖАНОЧАГА РОДУ

**1.** Разгледзьце табліцу.

| | | |
|---|---|---|
| Н. с. | якая? | *халодн*[*ая*] *ранн*[*яя*] (зіма) |
| Р. с. | якой? | *халодн*[*ай*] *ранн*[*яй*] (зімы) |
| Д. с. | якой? | *халодн*[*ай*] *ранн*[*яй*] (зіме) |
| В. с. | якую? | *халодн*[*ую*] *ранн*[*юю*] (зіму) |
| Т. с. | якой?<br>якою? | *халодн*[*ай*] *(аю) ранн*[*яй*] *(яю)*<br>(зімой(ою) |
| М. с. | аб якой? | *аб халодн*[*ай*] *ранн*[*яй*] (зіме) |

У якіх склонах прыметнікі жаночага роду адказваюць на адны і тыя ж пытанні і маюць аднолькавыя канчаткі?

**2.** Праскланяйце словазлучэнне *зялёная бяскрайняя раўніна*.

Н. с. якая? *зялён*[*ая*] *бяскрайн*[*яя*] *раўнін*[*а*]
Р. с. якой?

Складзіце і запішыце сказ са словазлучэннем у Н. склоне.

**3.** Прачытайце верш.

Радзіма ў нас бязмежная,
спякотная і снежная.
Радзіма ў нас цудоўная,
багаццяў розных поўная.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Радзіма ў нас лагодная,
нібы матуля родная.

*Артур Вольскі*

● Спішыце. Выдзеліце канчаткі назоўнікаў жаночага роду.

● Выпішыце словазлучэнні «назоўнік + прыметнік». Пастаўце пытанні. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў.

● Складзіце тры сказы пра Радзіму. Выкарыстайце прыметнікі з верша. Вызначце ў іх канчаткі.

**4.** Прачытайце прыметнікі. Падбярыце да іх назоўнікі.

свежая ..., снежная ..., працавітая ..., шустрая ..., рагатая ..., прыгожая ...

Складзіце з атрыманымі словазлучэннямі тры сказы і запішыце.

**46**

## НАЗОЎНЫ СКЛОН

Н. с. якая? *добрая ласкавая* (матуля)
*ціхая летняя* (раніца)

**1.** Прачытайце назоўнікі. Падбярыце да іх прыметнікі. Пастаўце пытанні.

лета (якое?) цёплае, сухое — н. р.
вясна (якая?) — ...
воблака ...
зязюля ...
вядро ...
зямля ...

Запішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце род прыметнікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Канчаткі прыметнікаў жаночага роду ў Н. склоне адрозніваюцца ад канчаткаў прыметнікаў ніякага роду.

Прыметнікі жаночага роду ў Н. склоне адказваюць на пытанне *якая?* і маюць канчаткі ***-ая (-яя)***: *рэчка* (якая?) *шырокая, сіняя*.

Прыметнікі ніякага роду ў Н. склоне адказваюць на пытанне *якое?* і маюць канчаткі ***-ое, -ае, -яе***: *надвор'е* (якое?) *сухое, цёплае, летняе*.

**2.** Прачытайце верш.

Белая бярозка,
дробная раса,
у полі каля вёскі
пасадзіў я сам.
— Ты расці, бярозка,
белая кара,
тоненькая ножка,
быццам з серабра.

*Рыгор Няхай*

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў жаночага роду.

**3.** Прачытайце сказы, якія запісаны па-руску. Перакладзіце іх на беларускую мову.

Маленькая серая птичка начинала день песней. Весёлая мелодия слышалась издалека.

Запішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў жаночага роду і іх склон.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце ўрывак з верша.

**Беларуская мова**

Ільняная і жытнёвая. Сялянская.
Барава́я ў казачнай красе.
Старажытная. Ты самая славянская.
Светлая, як травы ў расе.
Вобразная, вольная, пявучая
Мова беларуская мая!

*Пімен Панчанка*

Выпішыце прыметнікі, якія характарызуюць мову, па ўзоры: *мова* (якая?) *беларуская*. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.

**47**

## РОДНЫ, ДАВАЛЬНЫ, ТВОРНЫ І МЕСНЫ СКЛОНЫ

**1.** Разгледзьце табліцу. Звярніце ўвагу на канчаткі.

| | | |
|---|---|---|
| Р. с. | якой? | *цёпл\|ай\|, сух\|ой\|, ранн\|яй\|* (вясны) |
| Д. с. | якой? | *цёпл\|ай\|, сух\|ой\|, ранн\|яй\|* (вясной) |
| Т. с. | якой?<br>(якою?) | *цёпл\|ай\|, сух\|ой\|, ранн\|яй\|* (вясне)<br>*цёпл\|аю\|, сух\|ою\|, ранн\|яю\|* (вясною) |
| М. с. | аб якой? | *аб цёпл\|ай\|, сух\|ой\|, ранн\|яй\|* (вясне) |

Прыметнікі жаночага роду ў Р., Д. і М. склонах адказваюць на пытанне *якой?* і маюць аднолькавыя канчаткі: ***-ай, -ой, -яй***; у Т. склоне — ***-ай (-аю), -ой (-ою), -яй (-яю)***.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце словазлучэнні.

белая іскрыстая сняжынка, ранняя суровая зіма, марозная ціхая раніца

• Пастаўце адно са словазлучэнняў (на выбар) у Р. склоне. Запішыце, абазначце канчаткі.

• У якім словазлучэнні прыметнік ужыты ў Д. склоне? Запішыце яго, выдзеліце канчатак.

у сіняй сукенцы, за высокай агароджай, падарылі дарагой бабулі, пісьмо ад малодшай сястры

• Да прыметнікаў *чужая, моцная* падбярыце назоўнікі. Пастаўце словазлучэнні ў М. склоне. Запішыце.

**3.** Прачытайце сказы. Выпраўце памылкі.

1. Мама з маленькай бочкай пайшлі ў дзіцячы садок.
2. У дзяўчынкі доўгая каза.
3. Захварэла малая Дома і засталася Тома.
4. Снягір узімку любіць ласавацца чырвонай кабінай.

• Запішыце сказы правільна. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў жаночага роду.

• Запішыце сказы правільна. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў жаночага роду. Абазначце іх склон.

• Выпішыце словазлучэнні «назоўнік + прыметнік». Складзіце з імі новыя сказы.

**4.** Прачытайце сказы. Пастаўце словазлучэнні ў патрэбным склоне.



Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Веяў з (*цёмная дуброва*) лёгкі ветрык вечаровы. (*Васіль Вітка*) 2. Забалелі ў вавёрачкі зубкі — не можа раскусіць (*арэхавая шкарлупка*). (*Васіль Вітка*) 3. Наша (*вострая піла*) — не піла, а пчала. 4. Вам адно сказаць магу: не забудзе той, хто гляне, (*прыгажуня івалга*), птушку ў (*жоўты сарафан*).

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.

**48**

## ВІНАВАЛЬНЫ І ТВОРНЫ СКЛОНЫ

| | | |
|---|---|---|
| В. с. | якую? | *цёмн*[*ую*] *зімн*[*юю*] (ноч) |
| Т. с. | якой? | *цёмн*[*ай*] (*аю*) *зімн*[*яй*] (*яю*) (ноччу) |

В. і Т. склоны прыметнікаў жаночага роду адрозніваюцца па пытанні і канчатку.

Прыметнікі жаночага роду ў В. склоне адказваюць на пытанне *якую?* і маюць канчаткі ***-ую (-юю)***: *сін*[*юю*] *сукенку, жоўт*[*ую*] *кветку.*

У Т. склоне прыметнікі жаночага роду адказваюць на пытанне *якой?* і маюць канчаткі ***-ай (-аю), -ой (-ою), -яй (-яю)***: *сін* [*яй*] *(-яю) кветкай, звонк* [*ай*] *(-аю) песняй, сух*[*ой*] *(-ою) травой.*

**1.** Прачытайце сказы. Раскрыйце дужкі.

1. У (*пульхная зямля*) кладзецца зерне радамі. 2. Укрыліся зярняты (*пульхная зямля*). 3. (*Песня звонкая*) запеў у небе жаваранак. 4. Жаваранак пачынае дзень (*звонкая песня*). 5. На (*шырокая дарога*) выехала калона машын. 6. Над (*шырокая дарога*) праляцела стайка дзікіх качак.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.

**2.** Падбярыце прыметнікі ў В. і Т. склонах.

В. с. якую? →
- у … ваду
- пра … дзяўчынку
- на … яліну
- па … кнігу
- за … гару

Т. с. якой? якою? →
- з … песняй
- за … ракой
- над … задачай
- пад … сасной

Словазлучэнні запішыце. Вусна складзіце са словазлучэннямі некалькі сказаў.

**3.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх. Выкарыстайце прыметнікі ў дужках.

1. Якую песню спявалі вучні? (*народная*)
2. Якую работу прапанаваў ляснік дзецям? (*цікавая*)
3. Якую казку слухалі ўнукі? (*чароўная*)
4. За якую работу вучні атрымалі добрыя адзнакі? (*кантрольная*)

Адказы запішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце словы. Са словамі кожнага радка складзіце сказы.

рос, на, стары, лясной, дуб, паляне
трава, дуба, высокая, вакол, расла, зялёная
працягваў, у, дуб, моцныя, блакітнае, галіны, неба
сава, на, дуб, ноччу, вялікая, прылятала
у, траву, яна, пад, углядалася, дубам, пільна
зрывалася, яна, з, падала, і, зямлю, месца, часта, на, каменем
на, палявала, начная, мышэй, драпежніца

Запішыце 3—4 сказы (на выбар). Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў жаночага роду.

## 49

**1.** Аднойчы Дзяніс вырашыў пайсці да сябра ў госці. Дарослых дома не было. Выходзячы з дому, Дзяніс...

Паразважайце на гэту тэму. Што зрабіў Дзяніс?

Выкарыстайце словазлучэнні:

*паглядзеў у люстэрка, як ён выглядае;*
*прывёў у парадак вопратку;*
*напісаў запіску маме, куды пайшоў і калі вернецца;*
*выканаў сваё абяцанне.*

Прадоўжыце расказ. Запішыце яго.

А як вы паводзіце сябе ў такім выпадку? Падзяліцеся думкамі.

**во́пратка**

**2.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Жыве ў лесе маленькая шэрая птушка. Кожны вечар яна прылятае на бераг лясной ракі, дзе расце старая вярба. І пачынаецца чароўная песня. Ласкавая вясёлая мелодыя пераліваецца серабрыстай хваляй у ззянні блакітнай ракі. Песню маленькай шэрай птушкі ўсе любяць слухаць. Завуць гэту птушку салавей. *Паводле Алены Кобец-Філімонавай*

Спішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў жаночага роду.

---

**50**

**1.** Прачытайце словазлучэнні.

Зялёную траву, зімнюю сцюжу, сіняй хваляй, старога дрэва.

Вызначце ў словазлучэннях склон прыметнікаў.
Складзіце сказ з адным з гэтых словазлучэнняў і запішыце.

**2.** Прачытайце.

Якую работу выканалі вучні? (*кантрольная*)
Якую выставу наведалі дзеці? (*школьная*)

Запішыце поўныя адказы на пытанні, выкарыстоўваючы прыметнікі, што ў дужках. Абазначце склон прыметнікаў.

**3.** Прачытайце прыказкі.

Не трэба салавейку залат.. клетка, а трэба салавейку зялён.. ветка.
Святочн.. дню — святочн.. праца.
Дружн.. праца — крыніца багацця.

Спішыце, устаўляючы канчаткі прыметнікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх супрацьлеглымі па значэнні прыметнікамі.

Сцежка вузкая, а дарога ... .
Морква салодкая, а цыбуля ... .
Зіма марозная, а лета ... .
Трава сакавітая, а сена ... .
Рака глыбокая, а ручай ... .

Запішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў жаночага роду.

**51**

## ПРАВАПІС СКЛОНАВЫХ КАНЧАТКАЎ ПРЫМЕТНІКАЎ У МНОЖНЫМ ЛІКУ

**1.** Прачытайце і звярніце ўвагу, як змяняюцца па склонах прыметнікі ў множным ліку.

| | | |
|---|---|---|
| Н. с. | якія? | *добрыя блізкія* (людзі) |
| Р. с. | якіх? | *добрых блізкіх* (людзей) |
| Д. с. | якім? | *добрым блізкім* (людзям) |
| В. с. | якія? | *добрыя ціхія* (словы)<br>*добрых блізкіх* (людзей) |
| Т. с. | якімі? | *добрымі блізкімі* (людзьмі) |
| М. с. | аб якіх? | *аб добрых блізкіх* (людзях) |

Якія канчаткі маюць прыметнікі ў М. склоне множнага ліку?


Правообладатель Издательский центр БГУ

У якіх склонах прыметнікі множнага ліку маюць аднолькавыя канчаткі?

Якія канчаткі маюць прыметнікі множнага ліку ў В. склоне? У Д.? У Т.?

Прыметнікі ў множным ліку змяняюцца па склонах.

Склон прыметніка ў множным ліку вызначаецца па пытанні і назоўніку, да якога ён адносіцца: *спявай песні* (якія?) *вясёл*[ыя], *звонк*[ія] — В. с.; *падзякавай людзям* (якім?) *шчыр*[ым], *дараг*[ім] — Д. с.

**2.** Прачытайце словазлучэнне. Праскланяйце яго.

беларуск[ія] народн[ыя] меладычн[ыя] (песні)

Запішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў. Вусна складзіце некалькі сказаў.

**3.** Прачытайце прыметнікі. Пра каго або пра што ідзе размова?

старанныя, руплівыя, шчырыя, дбайныя ...
ласкавыя, мілыя, ветлівыя ...
назойлівыя, дакучлівыя, шкодныя ...
пахмурныя, панурыя, халодныя ...
пушыстыя, халодныя, белыя ...

Выканайце заданне вусна.

Словы для даведкі: *гурбы, дзеці, дні, насякомыя, людзі.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Прачытайце радкі з верша.



Заснулі белыя палеткі.
Мароз загрукаў на двары.
Зірнеш з акна:
Нібыта кветкі,
На сініх вербах снегіры.

*Анатоль Вялюгін*

Спішыце. У прыметніках множнага ліку выдзеліце канчаткі.

**пале́ткі**

52

## НАЗОЎНЫ І ВІНАВАЛЬНЫ СКЛОНЫ

**1.** Разгледзьце табліцу. Звярніце ўвагу на канчаткі прыметнікаў.

| | | |
|---|---|---|
| Н. с. | якія? | *шырок[ія], прыгож[ыя]* (што?) (дарогі) |
| | (якія?) | *адважн[ыя], смел[ыя]* (хто?) (воіны) |
| В. с. | якія? | *шырок[ія], прыгож[ыя]* (што?) (дарогі) |
| | (якіх?) | *адважн[ых], смел[ых]* (каго?) (воінаў) |

Трэба адрозніваць канчаткі прыметнікаў множнага ліку ў В. склоне.

Калі прыметнік адносіцца да назоўніка, які адказвае на пытанне *што?*, то пішацца канчатак ***-ыя (-ія)***: *шэр[ыя] нізк[ія] воблакі.*

Калі прыметнік адносіцца да назоўніка, які адказвае на пытанне *каго?*, то пішацца канчатак ***-ых (-іх)***: *верн[ых] блізк[іх] сяброў.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце словазлучэнні.

дзікія гусі, светлыя думкі, высокія горы, старыя вёскі, лясныя крыніцы

• Пастаўце словазлучэнні ў В. склоне. Вызначце канчаткі.

• Пастаўце словазлучэнні ў В. склоне. Складзіце з імі сказы. Сказы запішыце.

• Да назоўнікаў *маразы, завеі, людзі* падбярыце прыметнікі. Пастаўце іх у В. склоне. Складзіце са словазлучэннямі сказы. Запішыце іх.

**3.** Прачытайце тэкст.

Людзі заўсёды марылі адарвацца ад зямлі. У казках іх узнімалі чароўн.. дываны-самалёты, крылат.. коні. Сёння магутн.. ракеты лятаюць у космас. Складан.. прыборы перадаюць нам звесткі з яго глыбінь. Людзі мараць паляцець на далёк.. планеты.

*З часопіса «Вясёлка»*

Запішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў множнага ліку.

**4.** Прачытайце тэкст.

**Чалавечыя рукі**

Колькі цудоўных рэчаў зрабілі старанныя, умелыя, працавітыя рукі! Чалавечыя рукі шыюць, будуюць, пішуць, лечаць, друкуюць.

Цудоўныя машыны, магутныя станкі, хуткакрылыя самалёты і касмічныя караблі зрабілі рукі чалавека.

Праца рук робіць людзей разумнымі, шчаслівымі, дужымі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

• Спішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў множнага ліку.

• Выпішыце словазлучэнні «прыметнік + назоўнік». Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.

• Са словазлучэннямі *чалавечыя рукі, цудоўныя рэчы, касмічныя караблі* ў В. склоне складзіце новыя сказы і запішыце іх.

53

## РОДНЫ І МЕСНЫ СКЛОНЫ

**1.** Разгледзьце табліцу.

| | | |
|---|---|---|
| Р. с. | якіх? | *лясн[ых] сцяжынак* |
| | якіх? | *блізк[іх] знаёмых* |
| М. с. | аб якіх? | *аб лясн[ых] сцяжынках* |
| | аб якіх? | *аб блізк[іх] знаёмых* |

Якія канчаткі маюць прыметнікі множнага ліку ў Р. склоне? У М. склоне? Прывядзіце свае прыклады.

**2.** Пастаўце прыметнікі з назоўнікамі ў патрэбным склоне.

жывуць у (*прыгожыя гарады*), вяртаюцца з (*цёплыя краіны*), думае аб (*летнія дні*), сумаваць без (*птушыныя спевы*), ісці па (*знаёмыя вуліцы*), плывуць па (*сінія азёры*), пісаць у (*новыя сшыткі*)

Запішыце, выдзеліце канчаткі прыметнікаў.

**3.** Прачытайце радкі з верша. Вывучыце іх на памяць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Дождж**

На маленькіх тонкіх ножках
Па сцяжыначках-дарожках
Да вясковых стрэх
Знекуль буйны дождж прыбег.

*Кастусь Цвірка*

Запішыце верш па памяці. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.

**4.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.

Усё лясное насельніцтва ахвотна наведвае арэшнікавыя зараснікі. Днём тут ласуюцца стракатыя сойкі, рухавыя вавёркі, палявыя мышы. Трашчаць спелыя арэшкі ў птушыных дзюбах. Ноччу сюды прыходзяць лясныя жыхары: сакавітая трава, апалыя лісты, сухія галінкі — добры корм для іх.

Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў множнага ліку.

**зві́лісты, насе́льніцтва**

**54**

## ДАВАЛЬНЫ І ТВОРНЫ СКЛОНЫ

**1.** Разгледзьце табліцу.

| | | |
|---|---|---|
| Д. с. | якім? | *асенн[ім] прыгож[ым] кветкам* |
| | якім? | *добр[ым] старанн[ым] вучням* |
| Т. с. | якімі? | *асенн[імі] прыгож[ымі] кветкамі* |
| | якімі? | *добр[ымі] старанн[ымі] вучнямі* |



Правообладатель Издательский центр БГУ

Якія канчаткі маюць прыметнікі ў Д. склоне? У Т. склоне? Прывядзіце свае прыклады.

**2.** Прачытайце словазлучэнні. Пастаўце іх у Д. і Т. склонах.

замежныя госці, сапраўдныя сябры, пахвальныя лісты, бурныя рэкі, зялёныя верхавіны, маміны рукі, звілістыя сцяжынкі

Словазлучэнні запішыце ў два слупкі. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.

Складзіце вусна некалькі сказаў.

**3.** Прачытайце тэкст. Пастаўце прыметнікі і назоўнікі ў патрэбным склоне.

Багаты (*змешаныя лясы*) наш край. Гонкія сосны стаяць уперамежку з (*лісцевыя дрэвы*). Улетку лес поўніцца (*птушыныя спевы*).

Зімой пад (*зялёныя хвойкі*) знойдуць прытулак звяры і птушкі. (*Лясныя жыхары*) у лесе цёпла і ўтульна. Іх не палохае зіма з (*моцныя маразы*) і (*злосныя завеі*).

Запішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў.

**4.** Спішыце, раскрываючы дужкі.

Пісаць у (*школьныя сшыткі*).
Ісці па (*знаёмыя сцяжынкі*).
Сумаваць без (*птушыныя спевы*).

Абазначце склон прыметнікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Разгледзьце малюнак. Раскажыце аб горадзе.




Словазлучэнні для даведкі: *шырокія праспекты, прыгожыя вуліцы, цяністыя паркі, сучасныя заводы і фабрыкі, цудоўныя працавітыя людзі.*

Апавяданне запішыце.

**2.** Прачытайце верш.

Алеямі зялёнымі,
І ліпамі, і клёнамі,
І паркамі цяністымі
Упрыгожаны стаіш.

Ты рана прачынаешся
І сонцам умываешся,
І ў будучыню з гордасцю,
Наш родны Мінск, глядзіш.

*Аўяр'ян Дзеружынскі*

Спішыце. Выдзеліце канчаткі прыметнікаў множнага ліку.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**56**

**1.** Прачытайце загадку. Адгадайце яе.



Над высокімі гарамі,
Над шырокімі даламі
Што гарыць без полымя?
А пільным пажарным
Зусім не ў цяжар,
Іх не клічуць на пажар.

*Артур Вольскі*


Ці ведаеце вы, хто такія пажарныя? Раскажыце.

**2.** Прачытайце тэкст. Пастаўце прыметнікі множнага ліку ў патрэбным склоне.

Прыгожая прырода нашага роднага краю. Мы любім густ.. цёмн.. лясы, светл.. саснов.. бары, каляров.. дываны лугоў, спакойн.. рэкі і шырок.. сін.. азёры. Немагчыма ўявіць вобраз нашай Радзімы без цудоўн.., працавіт.., добразычлів.. людзей.

- Спішыце. Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў множнага ліку.
- Выпішыце словазлучэнні «прыметнік + назоўнік». Выдзеліце канчаткі і абазначце склон прыметнікаў.
- Складзіце і запішыце чатыры сказы з дадзенымі словазлучэннямі (на выбар).

**3.** Прачытайце сказы. Выпраўце памылкі.

1. Летнім ранкам **блакітнае** сонца ўзыходзіла з-за **чырвонага** возера. 2. На **высокім** балоце ўвосень мы збіралі **салод-**



Правообладатель Издательский центр БГУ

5. Як адрозніць вінавальны і творны склоны прыметнікаў жаночага роду?

60

# ЗАЙМЕННІК

**1.** Прачытайце тэкст. Звярніце ўвагу на выдзеленыя словы. Замест якіх слоў яны выкарыстаны?

**Пеця ў вёсцы**

Шасцігадовы Пеця толькі ў двары дзеда ўпершыню ўбачыў карову. Убачыў і закалаціўся як асінавы ліст.

— Баюся, **ён** укусіць...

— Гэта карова, Пеця, **яна** не кусаецца.

— Тады я ведаю, — сказаў **ён** упэўнена і бадзёра. — Карова дае малако.

Гэта было ў першы дзень прыезду Пеці. А назаўтра **ён** ужо ведаў усіх свойскіх жывёл. І нават без ніякага страху спрабаваў пакатацца на свінні.

*Іван Навуменка*

**Успомніце.** Словы ***я, ты, ён, яна, яно, мы, вы, яны*** — займеннікі. Займеннікі ўказваюць на асобу або прадмет, але не называюць іх.

| Асоба | Лік | |
|---|---|---|
| | адзіночны | множны |
| 1-я | *я* | *мы* |
| 2-я | *ты* | *вы* |
| 3-я | *ён, яна, яно* | *яны* |



Правообладатель Издательский центр БГУ

Якія займеннікі адносяцца да 1-й асобы адзіночнага і множнага ліку?

Якія займеннікі адносяцца да 2-й асобы? Да 3-й?

На што ўказвае займеннік?

Якія словы можа замяняць займеннік у тэксце?

Як вы думаеце, для чаго патрэбна замяняць словы-назвы?

**2.** Прачытайце дыялог. Замест кропак вусна ўстаўляйце патрэбныя займеннікі. Запішыце іх.

**Размова дзядулі з дзецьмі**

Дзядуля: Што ... рабілі, дзеці?

Дзеці: ... майстравалі кармушку для птушак.

Дзядуля: А што ... рабіў, Мікола?

Мікола: ... дошкі габляваў.

Дзядуля: А што рабіў Юра?

Дзяніс: ... збіваў кармушку.

Дзядуля: Дзе ж маленькі Антось?

Юра: ... збірае корм для птушак.

Абазначце асобу і лік займеннікаў, якія вы запісалі.

Ці займаліся вы падобнай карыснай справай?

Якія птушкі прыляталі на вашу кармушку?

Дапоўніце дыялог. Знайдзіце ў ім прымаўку. Растлумачце яе сэнс.

— Што робіць Антон?

— Майструе.

— ...?

— ... . Ён майстар на ўсе рукі. За што ні возьмецца, тое і зробіць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Прачытайце тэкст.

### Захапленне

Зіма выдалася марозная. Волечка зрэдку выходзіла з дому. Аднойчы яна замітусілася, пачала апранацца.

— Ты куды? — пытае маці.

— Я зараз, зараз... — Волечка адламала кавалак булкі і сунула ў кішэню.

— Што рабіць збіраешся? — зноў пытае маці.

— Мне шкада іх, — Волечка кіўнула галавой на акно. Яна выскачыла з хаты і пабегла да ракі.

Качкі зімавалі на Свіслачы. А ў мароз яны туліліся да берага. Волечка падышла да іх і пачала кідаць ім кавалачкі булкі.

Вось такое ў Волечкі пачалося захапленне.

*Паводле Паўла Кавалёва*

- Выпішыце сказы з займеннікамі. Падкрэсліце займеннікі.
- Запішыце тэкст. Абазначце асобу і лік займеннікаў.
- Прыдумайце працяг апавядання. Ужывайце займеннікі. Працяг запішыце.

**4.** Прачытайце тэкст.

### Сінічка дзякуе

Павесілі дзеці ў садзе каля школы для птушак кармушку. Кожны дзень яны прыносілі сюды зярняткі, кавалачкі сала.

Прыйшоў зімняй раніцай у школу Змітрачок. Яму вельмі хацелася паглядзець, як снедае сінічка. Сеў ён каля акна і сочыць. А вось і сінічка. Яна села каля сала і дзяўбе. Дзеўбане



Правообладатель Издательский центр БГУ

адзін раз і зазвініць, як званочак. Дзеўбане другі раз і зноў зазвініць, як званочак.

— Гэта яна дзякуе дзецям за пачастунак, — сказаў настаўнік.

*Паводле Васіля Сухамлінскага*

Адкажыце на пытанні.

Што паставілі дзеці ў садзе?

Чым кармілі сінічку?

Як частавалася сінічка?

Што сказаў дзецям настаўнік?

Перакажыце апавяданне (вусна).

Выпішыце сказы з займеннікамі. Абазначце іх асобу і лік.

61

## ЗМЯНЕННЕ АСАБОВЫХ ЗАЙМЕННІКАЎ

**1.** Прачытайце тэкст.

### Яблыкі

— Колькі будзе, калі да пяці дадаць пяць? — пытаецца настаўнік у першакласніка Андрэйкі.

Андрэйка задумаўся.

— Ну, **я** даў табе пяць яблыкаў. Потым яшчэ пяць. Колькі яблыкаў **ты** павінен **мне** аддаць?

— Дванаццаць, — выпаліў Андрэйка.

— Дрэнна, сядай, — сказаў настаўнік.

— Эх, **ты**! Сказаў бы — дзесяць. І ўсё было б добра, — шэпча **яму** сусед Саўка.

— Ага, дзесяць... **Я** дванаццаць прапанаваў, і то **ён** не згадзіўся.

*Васіль Ферапц*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Пастаўце пытанні да выдзеленых слоў. Да якой часціны мовы яны адносяцца?

Выпішыце займеннікі 1-й асобы, затым 2-й і 3-й.



Паводле тэксту падрыхтуйце маленькую сцэнку. Колькі будзе роляў?

Ці спатрэбяцца ў гэтай сцэнцы словы аўтара?

**Успомніце.** Займеннікі 3-й асобы адзіночнага ліку ўказваюць і на род:

*ён* — мужчынскі род,
*яна* — жаночы род,
*яно* — ніякі род.

**2.** Прачытайце.

1. Ён патрэбен нам усім дзеля працы, шчасця. Мы заўсёды разам з ім будзем усміхацца. (*Міхась Пазнякоў*) 2. Ён не такі, каб не сказаць праўды. (*Сяргей Грахоўскі*) 3. Усім на зямлі я давесці бяруся: няма прыгажэй ад маёй Беларусі. (*Артур Вольскі*) 4. Усе мы бачым сонца. Бачу я, бачыш ты. Бачыць ён. Бачаць яны. (*Мікола Гіль*) 5. Вось так яно часам бывае, што мы ў сумятлівым жыцці мінаем і не заўважаем красы родных мясцін. (*Мікола Хведаровіч*)

Знайдзіце і назавіце асабовыя займеннікі.

Вызначце іх лік.

Запішыце сказы з займеннікамі 3-й асобы адзіночнага ліку.

Абазначце род гэтых займеннікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Прачытайце.

1. Люблю я прасторы шырокіх палёў. 2. Ты расці, расці на славу, сінявокі даўгунец. 3. Мы любім сваю школу. 4. Ззяе ў небе ясны месяц, і блішчыць ён у вадзе. 5. Прыляцела вясна, вадою зямельку напаіла яна. 6. У прасторы звіняць пчолы — носяць мёд яны ў вулей.

Спішыце. Падкрэсліце займеннікі 1-й асобы адной лініяй, 2-й — дзвюма, 3-й — трыма.

**4.** Складзіце і запішыце тры сказы з займеннікамі 3-й асобы адзіночнага ліку на тэму «Мая школа».






Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Прачытайце.

## Ветлівы хлопчык

Я падышоў да электрычкі. Зайшоў у вагон. А там поўна дзяцей. ... смяяліся, жартавалі. Дзе б гэта толькі прысесці? Тут адзін хлопчык на бліжняй лаўцы заўважыў мяне. ... ускочыў з месца.

— Сядайце, калі ласка!

— А ... дзе сядзеш?

— ... сабе месца знайду! Не турбуйцеся!

Слаўны хлопчык. Ветлівы. Вось каб усе такія!

*Паводле Артура Вольскага*



Спішыце. Устаўце замест кропак патрэбныя займеннікі. Абазначце іх асобу і лік.

Ці назіралі вы падобную сітуацыю? Раскажыце. А можа, нешта было не так?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Прачытайце. Устаўце патрэбныя займеннікі.

1. У школе ... спасцігаеш усю тую мудрасць і ўсё тое добрае, што ёсць у твайго народа. 2. Сонца толькі што ўзышло, ... шле наўкол сваё святло. 3. Трыснёг шапоча, ад ветру хіліцца ... . 4. На зямлю павольна апускаліся сняжынкі, і былі ... такія крохкія, такія прыгожыя.

Спішыце. Абазначце асобу і лік займеннікаў. Апошні сказ разбярыце на членах сказа.

**трыснёг**

**3.** Прачытайце загадкі, якія запісаны па-руску. Перакладзіце іх на беларускую мову. Адгадайце загадкі.

Оно плавает без воды. Она человеку самая дорогая. Он летит без крыльев.

Запішыце. Падкрэсліце займеннікі.

**4.** Прачытайце.

1. Мой родны кут, як ты мне мілы!
   Забыць цябе не маю сілы!..
   К табе я ў думках залятаю
   І там душою спачываю. *Якуб Колас*

2. Мір вам, людзі, лясы і дубровы!
   Мір табе, залатая зямля! *Пятрусь Глебка*

Запішыце вершаваныя радкі па памяці (на выбар). Падкрэсліце займеннікі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Прачытайце сказы. Замест кропак устаўце прапушчаныя займеннікі 3-й асобы адзіночнага ліку.

1. Сёння ранак ціхі, ясны. Свежасць ... нясе палям. 2. Пеніцца возера, хвалюецца ... . 3. Шуміць сасна, ад ветру хістаецца ... . 4. Глуха шэпча лес зялёны, і шуміць ... , і шуміць. 5. Цячэ, бруіцца рэчанька, ніяк не змаўкае ... . 6. Ад спёкі ў стоме зямля, ... чакае дажджлівага дня. 7. Птушанятка падужэла, ... з гняздзечка паляцела. 8. Апускалася сонейка, за лес хавалася ... .

- Запішыце сказы. Падкрэсліце займеннікі.
- Выпішыце сказы з займеннікамі 3-й асобы адзіночнага ліку жаночага роду.
- Складзіце тры сказы з займеннікамі 3-й асобы адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду.

**2.** Прачытайце. Растлумачце значэнне выдзеленых слоў.





Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Многа клопату мы **мелі**,
млын паставілі на **мелі**,
але ён зусім не **меле**,
бо, відаць, зрабіць не **ўмелі**.

2. — Можа, я **парадую**
добрую **парадаю**?
— Ты старэйшы, **выручай**!
— Загаціце **вы ручай**!

*Сяргей Грахоўскі*

Спішыце. Падкрэсліце займеннікі. Абазначце іх асобу і лік. Да выдзеленых слоў запішыце блізкія па значэнні словы.

**3.** Падрыхтуйцеся пісаць пад дыктоўку.

**Анціпка**

Шмат разоў хадзіў **Анціпка** ў **пералесак**. Хадзіў ён туды збіраць суніцы. А вось у вялікім лесе Анціпка ніколі не быў. А пабыць там яму даўно хацелася. **Старэйшыя** хлапчукі не бралі яго з сабою. Крыўдна Анціпку. Яму ўжо сем гадоў, у гэтую восень ён пойдзе ў школу.

*Паводле Івана Сіняўскага*

Напішыце тэкст пад дыктоўку. Падкрэсліце займеннікі. Разбярыце па саставе выдзеленыя словы.

**4.** Складзіце і запішыце чатыры сказы з займеннікамі 3-й асобы адзіночнага ліку. Разбярыце іх па членах сказа.

эшало́н



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Прачытайце тэкст.

## Сувязны

Партызанскага сувязнога звалі Петрусём. Яму ішоў дванаццаты год. Хлопчык атрымаў важнае заданне. Ён вёў групу партызан патаемнымі ляснымі сцежкамі на станцыю.

Вось і чыгунка. Партызаны заляглі. Двое з іх папаўзлі на насып. Хутка яны вярнуліся. І паветра страсянуў магутны выбух. Пад адхон паляцеў эшалон з фашыстамі.

Партызаны кінуліся на станцыю. Пятрусь ледзь паспяваў за імі. Кулі са свістам праляталі над яго галавой. Пятрусь не чуў гэтага. Ён радаваўся перамозе.

*Паводле Мірона Марушкевіча*

Запішыце пераказ паводле плана.

*Прыкладны план*

1. Колькі гадоў было сувязному?
2. Якое заданне выконваў Пятрусь?
3. Што зрабілі партызаны?
4. Чаму радаваўся Пятрусь?

Падбярыце да слова *партызан* блізкія па значэнні словы. Праверце сябе: *народны мсцівец, баец*.

**2.** Прадоўжыце дыялог.

— Дзядуля, а ты бачыў жывога ваўка?
— Так, унучак, бачыў.
— А які ён, воўк?
— … .
— … .



Правообладатель Издательский центр БГУ

**65**

Асабовыя займеннікі змяняюцца па склонах.

**1.** Прачытайце. Звярніце ўвагу, як скланяюцца займеннікі 1-й і 2-й асобы.

| **Склон** | **Адзіночны лік** | |
|---|---|---|
| | **1-я асоба** | **2-я асоба** |
| Н. с. хто? | *я* | *ты* |
| Р. с. у каго? | *у мяне* | *у цябе* |
| Д. с. каму? | *мне* | *табе* |
| В. с. на каго? | *на мяне* | *на цябе* |
| Т. с. з кім? | *са мной (-ою)* | *з табой (-ою)* |
| М. с. пры кім? | *пры мне* | *пры табе* |

| **Склон** | **Множны лік** | |
|---|---|---|
| | **1-я асоба** | **2-я асоба** |
| Н. с. хто? | *мы* | *вы* |
| Р. с. у каго? | *у нас* | *у вас* |
| Д. с. каму? | *нам* | *вам* |
| В. с. на каго? | *на нас* | *на вас* |
| Т. с. з кім? | *з намі* | *з вамі* |
| М. с. пры кім? | *пры нас* | *пры вас* |

Як пішуцца прыназоўнікі з займеннікамі?

Прыназоўнікі з займеннікамі пішуцца асобна: ***у*** *мяне,* ***у*** *цябе,* ***у*** *вас,* ***да*** *нас,* ***з*** *вамі.*

**2.** Прачытайце тэкст «За вучобай». Спішыце. У дужках абазначце склоны займеннікаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Узор: *Я* (Н. с.) *займаюся ў музычным гуртку.*

Выканайце заданне па варыянтах.

**За вучобай**

*1-ы варыянт*

Я вучуся ў пятым класе. Па ўсіх прадметах у мяне добрыя адзнакі. Мне цікава ўсё ведаць. Мяне выбралі старастам класа. Са мной ходзіць у школу мой меншы брат Алесь. Пры мне заўсёды патрэбныя вучэбныя прылады.

*2-і варыянт*

Мы з братам любім музыку. Бацькі запісалі нас у музычную школу. Нам купілі скрыпку і баян. У нас на ўсё хапае часу. Намі задаволены бацькі і настаўнікі. Пра нас пісалі ў школьнай газеце.

Абмяняйцеся сшыткамі з сябрам і праверце заданне адзін у аднаго.

**3.** А як вучыцеся вы? Чым захапляецеся? Раскажыце.

**4.** Прачытайце пытанні.

А якой гадзіне ты ўстаеш?
Хто гатуе табе снеданне?
Хто з табой ідзе ў школу?
Якія школьныя прылады ты маеш?

Напішыце адказы на пытанні.

Займеннікі 1-й асобы падкрэсліце і вусна назавіце іх склоны.

**ме́ншы, рукза́к**



Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** Прачытайце верш.



**Рукзак**

Кажа Міша рукзаку:
— Што ты б’еш мне па баку?
Я і так ступлю, і сяк —
**зноў** ты муляеш, рукзак!
— Вось не знаў,
што ты слабак, —
шчыра **дзівіцца** рукзак.
— Стаў табе я непрыемны?
**Сціхні**! Скардзішся дарэмна.

*Мар’ян Дукса*

Для чаго патрэбен рукзак? Раскажыце.
Спішыце. Абазначце склон займеннікаў.
Зрабіце гука-літарны аналіз выдзеленых слоў.

**66**

**1.** Прачытайце. Устаўце патрэбныя займеннікі.

... зноў стаю перад бярозкаю, што пасадзіў сваёй рукой. (*Пятро Прыходзька*) ... для лаўкі дошкі пагаблюем трошкі. (*Артур Вольскі*) ... жывеш у сонечнай краіне. (*Казімір Камейша*) Малыя зайчаняткі стуліўшыся сядзяць, ... чакаюць маці, ва ўсе бакі глядзяць. (*Ніл Гілевіч*)

Спішыце. Абазначце асобу і лік займеннікаў.

**2.** Прачытайце. Прасачыце, як змяняецца займеннік ***я***. Да выдзеленых займеннікаў пастаўце пытанні.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Учора (...?) **я** быў у бібліятэцы. Да (...?) **мяне** падышоў Коля. Ён паказаў (...?) **мне** цікавую кнігу. Першыя старонкі кнігі (...?) **мяне** захапілі. (...?) Са **мною** былі Юра і Жэня. Ім спадабалася гэтая кніга.

Спішыце. Абазначце склон займеннікаў.

**3.** Пісьмова змяніце займеннікі, як патрабуюць пытанні.

Ёсць (хто?) я, ты.
Падышлі да (каго?) ..., ... .
Даручылі (каму?) ..., ... .
Паглядзелі на (каго?) ..., ... .
Сустрэліся з (кім?) ..., ... .
Гутарылі аб (кім?) ..., ... .

**4.** Прачытайце. Змяніце займеннік 2-й асобы, як патрабуе сэнс.

(Ты) прыходзіш у лес. Ён сустракае (ты) як сябра. Лес адкрывае (ты) свае таямніцы. Ціхім шэптам вітаюць (ты) векавыя хвоі, з (ты) вітаецца ўвесь лес.

Спішыце. Абазначце склон займеннікаў.

---

**67**

**1.** Прачытайце тэкст.

## Гадзюка

Гарачы дзень. На сцежцы грэецца **гадзюка**. Гадзюкі звычайна жывуць у драбналессі, каля старых пнёў. Кормяцца яны мышамі і мошкамі. Гадзюкі бываюць светлыя і цёмныя, але заўсёды з прыкметнай паласой на спіне. Яны вельмі злосныя. Укус гадзюкі балючы, часам прыводзіць да смерці. Паране-



Правообладатель Издательский центр БГУ

ную руку ці нагу неабходна туга перавязаць вышэй укушанага месца. Потым прамыць ранку моцным растворам марганцоўкі. Калі няма марганцоўкі, ранку можна прамыць гатаванай вадой. Параненаму карысна піць шмат вады. Гэта дапаможа хутчэй вывесці атруту з арганізма.

Падзяліце тэкст на часткі. Дайце часткам загалоўкі ў выглядзе пытанняў. Перакажыце тэкст па плане. Пераказ запішыце.

**2.** Прачытайце. Будзьце ўважлівымі. Ці так гэта?

Воўк — маленькі шэры звярок. Ён палюе на зайцоў, птушак. Жыве воўк у бярлозе.

Запішыце тэкст правільна.

**68**

## СКЛАНЕННЕ ЗАЙМЕННІКАЎ 3-й АСОБЫ

**1.** Прачытайце.

**Адзіночны лік**

| | | |
|---|---|---|
| Н. с. | хто? | *ён, яна, яно* |
| Р. с. | у каго? | *у яго, у яе, у яго* |
| Д. с. | каму? | *яму, ёй, яму* |
| В. с. | на каго? | *на яго, на яе, на яго* |
| Т. с. | з кім? | *з ім, з ёй (ёю), з ім* |
| М. с. | пры кім? | *пры ім, пры ёй, пры ім* |



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Замяніце, дзе трэба, словы ў дужках займеннікамі, каб пазбегнуць у тэксце паўтораў адных і тых жа слоў.



Хлопчык хадзіў па двары. (*Хлопчык*) сумаваў. Падышоў (*хлопчык*) да старога дрэва і ўзрадаваўся. На (*дрэве*) расцвіла дзівосная кветка. (*Хлопчык*) прыгледзеўся і пазнаў матылька паўлінава вока. (*Матылёк*) складваў і адкрываў прыгожыя крыльцы. (*Хлопчык*) глядзеў на яго і ўсміхаўся.

Аказваецца, што нават маленькі матылёк прыносіць чалавеку радасць.

*Паводле Алеся Марціновіча*

Чаму прыгожы матылёк можа прыносіць радасць? Што яшчэ радуе чалавека? Запішыце.



**3.** Прачытайце. Падумайце, што трэба зрабіць, каб аднолькавыя назоўнікі не паўтараліся ў сказах. Перабудуйце сказы, запішыце. Займеннікі падкрэсліце.



Другі дзень гудзе мяцеліца. Мяцеліца замяла вуліцы, дарогі, засыпала кармушкі. Міша і я ўспомнілі пра птушак. Міша і я пайшлі ў сад. Віця пайшоў з намі. Віця вярнуўся па корм. Паўлік з Дзімам захацелі дапамагчы. Паўлік з Дзімам прынеслі лесвіцу. Разам мы зноў адкрылі птушыную сталоўку.

Зрабіце гука-літарны разбор слова *адкрылі*.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Пры ветлівым пісьмовым звароце да настаўніцы, незнаёмага або старэйшага па ўзросце чалавека займеннік ***Вы*** і яго склонавыя формы ***Вас, Вам, Вамі*** пішуцца з вялікай літары.

**72**

С. п.

**1.** • Спішыце. Займеннікі ў дужках змяніце так, як патрабуе сэнс. Выкарыстайце патрэбныя прыназоўнікі.

Вучыў (каго?) (*я, ты, яна, ён, яны*).
Вучыўся (з кім?) (*я, Вы, яна, яны*).
Чытаў (пра каго?) (*я, мы, Вы*).
Чытаў (з кім?) (*ты, ён, яны*).

• Складзіце некалькі словазлучэнняў назоўніка з займеннікам. З гэтымі словазлучэннямі складзіце сказы і запішыце іх. Абазначце род і лік займеннікаў.

• Складзіце сказы з дадзенымі ніжэй словазлучэннямі. Аб’яднайце іх тэмай «Кніга — мой сябар».

з сябрам — з ім, у бібліятэцы — у ёй, з кнігай — з ёй

Запішыце складзены тэкст. Абазначце склон займеннікаў.

**2.** Перастаўце сказы так, каб атрымалася апавяданне. Запішыце яго.

**Юныя кнiганошы**

Толькі хваляваліся дарэмна.
Спачатку мы хваляваліся.
Не так даўно ў нашым класе адбыўся сход.
Не ведалі, як сустрэнуць нас людзі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

У кожным доме бралі кнігі і запрашалі прыходзіць часцей.

На гэтым сходзе мы вырашылі арганізаваць атрад кніганошаў.

Многім з нашых аднавяскоўцаў мы дапамаглі падабраць дамашнія бібліятэкі. *Паводле Васіля Пілipюка*

**экзэмпля́р**

Адкажыце на пытанні.

Як вы адносіцеся да кніг?

Ці любіце вы іх чытаць? Чаму?

Як ставяцца да кніг вашы сябры?

**3.** Перастаўце сказы так, каб атрымалася апавяданне. Запішыце яго.

**Цікавая кніга**



Тата тады сказаў, што гэтай знаходкай у яго кнізе пачнецца новая старонка. Валерыкаў тата — геолаг. **Тата часта перабірае камяні і расказвае Валерыку пра розныя здарэнні.** Кавалак вапняку з ракавінамі хлопчык адшукаў сярод цэлай гары зямлі і камення. Там ляжыць і Валерыкава знаходка. Кожная скрынка падобна на цікавую кнігу. У яго поўныя скрынкі камянёў. *Паводле Вісарыёна Гарбука*

Адкажыце на пытанні.

Кім працуе Валерыкаў тата?

Чым ён захапляецца?

Якую знаходку падараваў Валерык тату?

Што сказаў тата? Хто такі геолаг?

Выдзелены сказ разбярыце па членах сказа.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## 73

**1.** Прачытайце. Замест выдзеленых слоў ужывайце патрэбныя займеннікі.

Аднаго разу Дзяніс убачыў, як сястра пісала пісьмо. Дзянісу вельмі хацелася ведаць, пра што **сястра** піша. **Дзяніс** ціхенька падкраўся і заглянуў праз плячо. Сястра заўважыла гэта, але нічога не сказала. **Сястра** проста напісала: «А Дзяніс заўсёды чытае чужыя пісьмы».

Спішыце.

**2.** Прачытайце. Замяніце назоўнікі займеннікамі, як патрабуе сэнс.

прыехалі да дзяцей — прыехалі да (вы)
пазнаёміўся з леснікамі — пазнаёміўся з (вы)
паглядзеў на бацькоў — паглядзеў на (вы)
расказаў пра школьнікаў — расказаў пра (мы)
прыйшлі да знаёмых — прыйшлі да (яны)

Спішыце.

**3.** Прачытайце. Займеннік ***вы*** змяніце па склонах.

Кніга — цудоўная знаходка чалавека. Па кнізе (вы) вучыцеся чытаць. Потым кніга раскажа (вы) пра цікавыя падзеі ў жыцці. Яна навучыць (вы) любіць свой народ. Яна будзе з (вы) пастаянна — як блізкі і надзейны сябар.

Запішыце.

**4.** Прачытайце.

Сын яго вучыцца на інжынера. (*Кузьма Чорны*) Як прыемна дарыць людзям, як добра прыносіць ім радасць. (*Сяргей Гра-*


Правообладатель Издательский центр БГУ

*хоўскі*) Дачка павярнулася да бацькі, азарыла яго светлай усмешкай. (*Аркадзь Куляшоў*) Чым далей адыходзіў Сцёпка ад сяла, тым больш мілым яно станавілася яму. (*Якуб Колас*)

Спішыце. Абазначце склон займеннікаў.

**74**

**1.** Прачытайце тэкст.

**Не разгубіўся**

Я спыніўся каля саду. Стаяў ціхі цёплы надвячорак. Пачуўся трывожны крык птушкі.

Я зірнуў угару. Раз'юшаны каршун лавіў шпака. Драпежнік залятаў шпаку то збоку, то спераду, то кідаўся на яго зверху.

Я моцна свіснуў. Шпак закружыў у паветры, склаў крылы і каменем паляцеў на мяне. За ім імчаўся каршун. Шпак упаў ля маіх ног, а каршун са свістам праляцеў над галавой.

Калі драпежнік быў ужо высока, шпак абтросся ад пылу, спакойна паглядзеў на мяне і паляцеў на ліпу. Там школьнікі яшчэ вясной прымацавалі шпакоўню.

*Паводле Уладзіміра Ляўданскага*





Правообладатель Издательский центр БГУ

Дайце імя хлопчыку, які расказаў гэту гісторыю. Напішыце пераказ ад 3-й асобы.

*Прыкладны план*

1. Цёплы надвячорак.
2. Каршун ловіць шпака.
3. Шпак шукае дапамогі.
4. Небяспека мінула.

**2.** Праскланяйце займеннікі ***ён, вы*** (вусна).

**75**

**1.** Прачытайце. У дадзеных сказах знайдзіце займеннікі, пастаўце да іх пытанні.

Калі ты спознішся, мы паедзем без цябе.
Я абавязкова дапамагла б, але ў мяне баліць рука.

Спішыце, займеннікі падкрэсліце.

**2.** Прачытайце. Выберыце адну з прапанаваных у дужках формаў займенніка ***ты***.

**Гутарка асоту з крапівою**

— Што ты патыкаешся са мною? — крычала крапіва асоту. — Ці я (*табе, цябе*) раўня? Нічога ты не робіш; ніхто (*табе, цябе*) не ведае. А крапіву кожны ведае, кожны спамінае, на кожным падворку расту я.

*Паводле Цёткі*

Спішыце.

**3.** Прачытайце. Выпраўце тэкст, ужываючы замест слоў у дужках займеннікі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Леў Сапега быў канцлерам Вялікага Княства Літоўскага.

Калі княжычу споўнілася шэсць гадоў, бацькі адвезлі (*хлопчыка*) вучыцца ў Нясвіж. У Нясвіжскім замку працавалі вядомыя вучоныя. (*Вучоныя*) ведалі старажытныя і сучасныя мовы. Беручы з (*вучоных*) прыклад, Леў Сапега яшчэ ў дзяцінстве вывучыў лацінскую, грэчаскую, нямецкую і польскую мовы. Кожны дзень (*Сапегу*) бачылі ў замкавай бібліятэцы.

*Паводле Уладзіміра Арлова*

Спішыце. Падкрэсліце займеннікі і абазначце іх склон.

**4.** Праскланяйце займеннікі ***ты, яны***.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. с. | *ты* | *яны* | В. с. | ... | ... |
| Р. с. | ... | ... | Т. с. | ... | ... |
| Д. с. | ... | ... | М. с. | ... | ... |

Складзіце і запішыце тры сказы, ужываючы займеннікі.

**76**

**1.** Прачытайце словазлучэнні.

гутарылі пра яго, даручыце мне, убачыў яе, чакаем іх, любуюся табой, прыйшоў да цябе, ганаруся імі

Спішыце. У дадзеных словазлучэннях знайдзіце займеннікі, падкрэсліце іх.

**2.** Праскланяйце займеннікі ***яно, яны***.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. с. | *яно* | *яны* | В. с. | ... | ... |
| Р. с. | ... | ... | Т. с. | ... | ... |
| Д. с. | ... | ... | М. с. | ... | ... |

Складзіце і запішыце 2—3 сказы, ужываючы займеннікі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Прачытайце.

Выпраўце тэкст, ужываючы замест слоў у дужках займеннікі.

Еўфрасіння Полацкая займае пачэснае месца ў нашай старажытнай гісторыі. (*Еўфрасіння Полацкая*) была першай асветніцай беларускай зямлі. Імя (*Еўфрасінні Полацкай*) стала сімвалам імкнення да ведаў, таму імя (*Еўфрасінні Полацкай*) і перажыло стагоддзі.

Князёўна таемна ўцякла ў манастыр. Там (*князёўна*) чытала, перапісвала кнігі і нават пісала летапісы.

*Паводле Уладзіміра Бутрамеева*

Падкрэсліце займеннікі і абазначце іх склон.

**4.** Прачытайце.

**У страху вочы вялікія**

Кася з Янкам пайшлі ў бярозавы гай суніцы збіраць. Ідуць ... павольна, на ўсе бакі аглядаюцца.

— ... не бойся, Кася. Калі выскачыць воўк, ... абараню цябе, — гаворыць Янка сястры.

— А ... і не баюся, — адказвае ... . А ў самой сэрца стукае моцна-моцна.

*Паводле Алеся Марціновіча*

Спішыце, устаўляючы замест кропак патрэбныя займеннікі.

## 77

**1.** Прачытайце.

Родная беларуская зямля, яна гераічная і шматпакутная. Многа разоў на ёй грукаталі войны. Але мы, дзеці Беларусі, ганарымся тым, што ў гэтых войнах яна ніколі не была агрэ-



Правообладатель Издательский центр БГУ

сарам. Іншая справа, што ёй даводзілася бараніцца ад ворагаў. Народ беларускі — ён адстаяў сваю веру і праўду.

*Паводле Уладзіміра Караткевіча*

Спішыце. Абазначце асобу, лік і склон займеннікаў.

**2.** Прачытайце. Змяніце займеннікі па пытаннях.

гуляў (з кім?) з (яна), сустракалі (каго?) (мы), падарыў (каму?) (ты), запрасіў (каго?) (вы), зайшоў (да каго?) да (ён), паказаў (на каго?) на (яна), сябруе (з кім?) са (я)

Спішыце. Абазначце склон.

**3.** Складзіце і запішыце некалькі сказаў пра сябра (сяброўку).

Выкарыстайце займеннікі ***яна, яе, ёй*** (***ён, яго, яму***).

**4.** Прачытайце.

Я люблю народную песню. Яна лёгка спяваецца і запамінаецца. Юра і я любім спяваць. Мы наведваем школьны хор і вучым новыя песні.

Спішыце. Абазначце асобу і лік займеннікаў.

**78**

**1.** Абазначце склон займеннікаў у спалучэннях слоў. Запішыце ў дужках пачатковую форму кожнага займенніка.

да цябе, для вас, ад мяне, пра яго, з табой, у яе, для нас

**2.** Прачытайце, устаўляючы прыназоўнікі ***пра, з, са, у*** перад займеннікамі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

… вамі, дарагія прасторы, я чакаю сустрэчы.
… цябе, Радзіма, надзейныя абаронцы.
… мною поле пшанічным коласам гамоніць.
… вас, нівы і дубровы, складаюць песні паэты.

Спішыце. Растлумачце правапіс прыназоўнікаў з займеннікамі.

**3.** Прачытайце.

Колькі радасці ад птушак, калі вясной … вяртаюцца з выраю! Каля хаты, у полі, у лесе чуваць … ласкавы спеў. … не змаўкае ўсю вясну. … люблю слухаць шпакоў, ластавак, жаўрукоў.

*Паводле Івана Грамовіча*

Спішыце. Абазначце асобу, лік і склон займеннікаў.

**4.** Падбярыце да дадзеных дзеясловаў займеннікі. Вызначце асобу і лік займеннікаў.

Наведаў (каго?) яго, іх, мяне.
Спыніўся (каля каго?) …
Расказаў (аб кім?) …

## 79

**1.** Як напісаць сачыненне на тэму «Сапраўдны сябар».

1. Успомніце які-небудзь выпадак, калі ваш таварыш праявіў сябе сапраўдным сябрам.

2. Ваша сачыненне на тэму «Сапраўдны сябар» павінна складацца з чатырох частак.


Правообладатель Издательский центр БГУ

У першай частцы сачынення раскажыце пра тое, калі і дзе адбыўся той ці іншы выпадак.

У другой частцы раскажыце, з чаго ўсё пачалося.

Трэцяя частка сачынення — галоўная. Апішыце ўчынак (паводзіны) свайго сябра (сяброўкі).

У чацвёртай частцы раскажыце пра тое, чым усё закончылася.

3. У сачыненні ўжывайце словы і словазлучэнні: *гэта было, аднойчы, дапамагчы, мой сябар, сапраўдны сябар*.

4. Прачытайце прыказкі і растлумачце іх сэнс. Дайце загаловак свайму сачыненню прыказкай пра дружбу (на выбар).

*Той сябар, хто дапамог у бядзе.*

*Сябра лёгка згубіць, але цяжка знайсці.*

5. Сачыненне можна пачаць так:

Віця — сапраўдны сябар, таму што ён ... .

Таня — сапраўдная сяброўка, таму што яна ... .

6. Запішыце сваё сачыненне. Праверце напісанае.

7. Прачытайце сваё сачыненне на тэму «Сапраўдны сябар». Скажыце, калі мы гаворым пра чалавека, што ён сапраўдны сябар.

 Прадоўжыце дыялог.

— Добры дзень, Маша!

— Добры дзень, Коля!

— Ты сёння вельмі рана прыйшла ў школу.

— Ведаеш, я не рашыла прыклады.

— ... .

— ... .

Дыялог запішыце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Падбярыце да слова ***сябар*** блізкія па значэнні словы.

Праверце сябе: *таварыш, друг, прыяцель, дружбак, свой чалавек.*

1. Што такое займеннік?
2. У ролі якіх членаў сказа выступаюць займеннікі?
3. Назавіце асабовыя займеннікі.
4. Назавіце займеннікі, якія ўказваюць на лік.
5. Назавіце займеннікі 3-й асобы, якія ўказваюць на род.
6. Як змяняюцца асабовыя займеннікі?
7. Як пішуцца прыназоўнікі з займеннікамі?
8. Прывядзіце свае прыклады.

## АДГАДКІ

Дзень і ноч, гром (с. 7)
Блін (с. 46)
Кот, возера (с. 70)
Сонца (с. 96)
Воблака, радзіма, вецер (с. 108)



Правообладатель Издательский центр БГУ

# СЛОЎНІК

**А**
акія́н
аэрадро́м

**Б**
бібліятэ́ка

**В**
верталёт
во́пратка

**Д**
дырэ́ктар
ды́спут

**К**
ко́мплекс
крыжадзю́б

**Л**
люстэ́рка

**Н**
насе́льніцтва
насу́страч

**П**
палéткі
педа́ль
пісьме́ннік

**Р**
рукза́к

**С**
самалёт
сталява́р

**Т**
трыснёг
тэлегра́ф
тэлефо́н

**Э**
экзэмпля́р
электры́чнасць
эшало́н

Правообладатель Издательский центр БГУ

# ЗМЕСТ

ПАЎТАРЭННЕ ........ 4

НАЗОЎНІК ........ 44
Нескланяльныя назоўнікі ........ 47

ПРЫМЕТНІК ........ 59
Змяненне прыметнікаў па родах, ліках і склонах ........ 61
Скланенне прыметнікаў ........ 65
Правапіс склонавых канчаткаў прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду ........ 68
*Назоўны і вінавальны склоны* ........ 68
*Родны склон* ........ 70
*Давальны склон* ........ 72
*Творны і месны склоны* ........ 74
Правапіс склонавых канчаткаў прыметнікаў жаночага роду ........ 79
*Назоўны склон* ........ 80
*Родны, давальны, творны і месны склоны* ........ 82
*Вінавальны і творны склоны* ........ 84
Правапіс склонавых канчаткаў прыметнікаў у множным ліку ........ 88
*Назоўны і вінавальны склоны* ........ 90
*Родны і месны склоны* ........ 92
*Давальны і творны склоны* ........ 93



Правообладатель Издательский центр БГУ

ЗАЙМЕННІК ........ 101
Змяненне асабовых займеннікаў........ 104
Скланенне займеннікаў 3-й асобы........ 116

Адгадкі ........ 132
Слоўнік ........ 133

Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |


Вучэбнае выданне

**Альфер** Маргарыта Віктараўна
**Сафонава** Ала Пятроўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 5 класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 1

Галоўны рэдактар *В. С. Паўколас*
Рэдактар *Н. Б. Кучмель*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Тэхнічнае рэдагаванне *К. У. Раманчык*
Камп'ютарная вёрстка *Н. Я. Бацюковай*
Карэктары *Т. М. Булатава, В. М. Іваной*
Мастакі *Г. Ф. Булатава, Л. А. Мурашка, Н. У. Сустава*

Падпісана ў друк 25.03.2013. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,94. Ул.-выд. арк. 4,4. Тыраж 925 экз. Заказ 69.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
ЛИ № 02330/0494361 ад 16.03.2009. ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.


Правообладатель Издательский центр БГУ